„ДЗЕНЬ УРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ“

ператворым у масавы паход за пасьпяховае сканчэньне асеньніх сельска-гаспадарчых кампаній,

за зяблева, за агратэхніку, за высокую ўраджайнасьць, за вытворчае ўмацаваньне калгасу

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ўперад да новых перамог у справе сацыялістычнай рэканструкцыі і тэхнічнага пераўзбраеньня сельскай гаспадаркі

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 280 (4186)
Серада 14 кастрычніка 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫНКА.

Сьвята сацыялістычнага зямляробства

Больш 10 тысяч калгасаў, якія яднаюць каля 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР, 329 саўгасаў, ператварэньне іх у асноўных вытворцаў сельска-гаспадарчай прадукцыі, а калгасьнікаў — у сапраўды моцную апору партыі на вёсцы, ператварэньне БССР в раёну спажываючага ў раён буйной сацыялістычнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур — вось пераможны шлях сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Гэтыя буйныя перамогі стапі магчымы толькі дзякуючы няўхільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі на індустрыялізацыю краіны, на пашырэньне энэргетычнай і мэталюргічнай базы, толькі дзякуючы брацкаму падтрыманьню БССР усім рэспублікамі Савецкага Саюзу. Гэтыя вялікія дасягненьні ў разьвіцьці сацыялістычнага зямляробства КП(б)Б заваявала ў адкрытых жорсткіх клясавых баёх супроць кулацтва і яго агентуры—правых апартуністаў, супроць «левых» загібшчыкаў.

Сёньня працоўныя масы БССР праводзяць «Дзень ураджаю і калектывізацыі». Гэта сьвята сацыялістычнага зямляробства — дзень агляду нашых дасягненьняў у саўгасным і калгасным будаўніцтве — будзе праводзіцца на працягу бліжэйшай дэкады, як дзесяцідзеньнік бальшавіцкага паходу за новыя посьпехі на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Задачы дзесяцідзеньніка калектывізацыі і ўраджаю — гэта задачы новага этапу калгаснага будаўніцтва.

Вясковыя партыйныя арганізацыі пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б правялі гіганцкі вялікую работу па аб'яднаньні бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы. Сотні і тысячы камуністаў вёскі зьяўляюцца сапраўды ударнай брыгадай у змаганьні за калгаснае будаўніцтва. Яны, мабілізуючы беднату і серадняку, былі арганізатарамі буйнейшых перамог на фронце калектывізацыі. Надзвычайна вялікую дапамогу ім аказалі прысланыя пралетарыятам перадавыя ўдарнікі фабрык і заводаў—рабочыя 25-тысячнікі. Гэта армія кіраўнікоў калгаснага руху, няўхільна ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, перамагаючы ўсякія ўхілы і хістаньні, злмаваючы на шляху пераможнага наступленьня супраціўленьне правых і «левых» апартуністаў, вяла за сабой мільёны беднякоў і сераднякоў, брала крэпасьць за крэпасьцю.

Сацыялізм заваяваў у вёсцы рашаючыя пазыцыі. Калгасны рух уступіў у новы этап свайго разьвіцьця. Яго далейшыя посьпехі залежаць ад АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЗАМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ, што зьяўляецца ГАЛОЎНАЙ, ВУЗЛАВОЙ ЗАДАЧАЙ усіх вясковых партыйных арганізацый.

Арганізацыйна і гаспадарча замацаваць калгас, гэта значыць — стварыць новую грамадзкую дысцыпліну працы, прывіць навыкі калектыўнай працы ўчарайшаму дробнаму ўласьніку, дасягнуць злучэньня яго асабістага інтарэсу з агульна-калгасным, укараніць у гаспадарку сацыялістычныя пачаткі ўліку і кантролю, правільна арганізаваць працу, узьняць таварнасьць гаспадаркі і ўзровень сацыялістычнага накапленьня, выхаваць новыя кадры работнікаў і кіраўнікоў сацыялістычнага зямляробства. Практычна ажыцьцявіць гэтыя асноўныя ўмовы магчыма толькі праз увядзеньне зьдзельшчыны, дакладную пастаноўку ўліку працы, праз ліквідацыю абязьлічкі ва ўсёй сыстэме калгаснай вытворчасьці, гэтага можна дасягнуць толькі пры разьмеркаваньні ўраджаю па прынцыпе: «Хто больш працуе, той больш і атрымлівае».

Гэтыя мерапрыемствы ў сваёй агульнай складанасьці ёсьць тое асноўнае зьвяно, за якое трэба ўхапіцца для таго, каб забясьпечыць новы яшчэ большы ўздым калгаснага будаўніцтва.

Правесьці арганізацыйна - гаспадарчае замацаваньне калгасаў магчыма толькі на аснове бязьлітаснага змаганьня на два фронты супроць правых апартуністаў, якія ігнаруюць гэтае важнейшае мерапрыемства, і супроць «левых» загібшчыкаў, якія ў пагоні за неадкладным стопроцантным ахопам усіх бядняцка - серадняцкіх гаспадарак калектывізацыяй забываюць арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў. Правыя апартуністы адкрыта дапамагаюць кулаку сваёй недацэнкай важнейшай вузлавой задачы, а «левыя» апартуністы ў пагоні за голай лічбай дапамагаюць правым.

Вось чаму ЦК. УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б рашуча папярэджваюць партыйныя арганізацыі ад пагоні за голай лічбай.

Пытаньне якасных паказальнікаў саўгаснага і калгаснага вытворства набывае ў даны момант першачарговае значэньне. Так, Якаўлеў т сваёй прамове на пашыраным пасяджэньні Калегіі Наркамзему СССР сказаў: «Мы навучыліся скарыстоўваць перавагі калгасаў для пашырэньня пасеўных плошчаў, але яшчэ не навучыліся выкарыстоўваць гэтыя перавагі ў справе павышэньня ўраджайнасьці».

Правядзеньне дэкадніка калектывізацыі і ўраджаю супадае з правядзеньнем абвешчанага ЦК КП(б)Б двухмесячніка —паходу за выкананьне плянаў разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Па БССР на сёньнешні дзень арганізавана 916 малочна - таварных фэрм, у якіх налічваецца 65.274 шт. стада, што складае толькі 80 проц. намечанага пляну. Сьвінагадоўчых таварных фэрм арганізавана 1392 з агульным пагалоўем 63.200 штук. Па плане да канца 1932 году намячаецца арганізаваць 3.000 сьвінагадоўчых таварных фэрм з пагалоўем у 300.000 штук сьвінаматак. Задачы грандыёзныя. Яны абавязваюць усе партыйныя арганізацыі і ячэйкі ўжыць рашучыя меры для таго, каб забясьпечыць нармальныя ўмовы для зімоўкі скаціны. Будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў, пашырэньне кармовай базы — вось тыя пытаньні, якія стаюць у парадку дня. Жывёлагадоўчыя саўгасы і калгасныя фэрмы павінны даць сапраўдныя ўзоры бальшавіцкага змаганьня за сацыялістычную жывёлагадоўлю. Якасьць — паставіць у цэнтр увагі сельска - гаспадарчых рабочых і калгасьнікаў. Якасьці-ж можна дасягнуць толькі бязьлітасна выгнаўшы абязьлічку, толькі правільна арганізаваўшы працу, толькі шырока разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі зьяўляецца асноўным вытворцам тэхнічных культур. Пасеўная плошча пад ільном і канопляміі з кожным годам пашыраецца. Пад разьвіцьцё ільнаводзтва ў БССР падведзена магутная тэхнічная база. У гэтым годзе будуецца 46 ільназаводаў. Мабілізаваць увагу калгасьнікаў і рабочых ільнаводчых саўгасаў на сваячасовае сканчэньне першапачатковай апрацоўкі ільну, на змаганьне за якасьць ільнавалакна — такава задача партыйных ячэек у «Дзень ураджаю і калектывізацыі».

МТС—магутнья рухавікі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Іх роля ў справе арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў, у справе павышэньня ўраджайнасьці і таварнасьці калектыўных гаспадарак надзвычай вялікая. МТС пад кіраўніцтвам сваіх партыйных ячэек гэту задачу павінны выканаць.

Пасьпяхова правесьці «Дзень ураджаю і калектывізацыі», гэта значыць узьняць усю суму пытаньняў, якія ставіць на даным этапе партыя, дабіцца пасьпяховага правядзеньня асноўных сельска-гаспадарчых работ і гаспадарча-палітычных кампаній. Сканчэньне ўборкі бульбы, малацьба, зяблева, збожжазагатоўкі, адгрузка бульбы пралетарскім цэнтрам — вось задачы, вырашэньне якіх трэба шчыльна зьвязаць з правядзеньнем «Дня калектывізацыі і ўраджаю».

Узмацненьне масавай работы сярод бядняцка - серадняцкіх мас аднаасобнікаў, цесная ўвязка яе з задачамі калектывізацыі с.-г., рашучая барацьба з ігнараваньнем аднаасобнага сэктару — неадлучная частка дэкадніка.

Буйныя посьпехі на фронце калектывізацыі па-новаму ставяць пытаньне аб партыйнай рабоце на вёсцы. Саўгасы, МТС і калгасы на справе ператварыць у апорныя пункты партработы на вёсцы —павінна кожная партарганізацыя. У справе перабудовы партыйнай работы КП(б)Б набыла значныя посьпехі. Зараз больш 75 сельпарткомаў арганізавана ў вясковых партарганізацыях. Удасканальваць мэтады і формы іх работы, падначаліць яе зьмест асноўным задачам калгаснага руху, перанесьці цэнтр цяжару партработы ў нізавое вытворчае зьвяно — такава задача на сёньнешні дзень.

«Дзень ураджаю і калектывізацыі» павінен стаць паходам партыйных арганізацый і шырокіх мас калгасьнікаў за арганізацыйна - гаспадарчае замацаваньне калгасаў, за новыя посьпехі на фронце калгаснага будаўніцтва.

Да ўсіх рабочых, работніц, калгасьнікаў, калгасьніц, беднякоў і сераднякоў

АДОЗВА ЦК КП(б)Б

ТАВАРЫШЫ!

Рабочая кляса Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК дабілася бліскучых посьпехаў ва ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Растуць і ўступаюць у строй новыя гіганты сацыялістычнай прамысловасьці, пашыраецца мэталюргічная і энэргетычная база, шпаркімі тэмпамі разьвіваецца лёгкая індустрыя. Гігацкія посьпехі здабыты на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у справе разьвіцьця сацыялістычнага зямляробства. Савецкія гаспадаркі ў бягучую вясну засявалі 8 млн. гэкт. На сацыялістычных палёх Савецкага Саюзу ў сучасны момант працуе звыш 1.250 МТС. У галіне калгаснага будаўніцтва аказаліся далёка перавышанымі ўсе папярэднія пляны і памячэньні.

На БССР калектывізавана каля 50 проц. бядняцка - серадняцкіх гаспадарак, арганізавана 329 саўгасаў з пасеўнай плошчай у 610 гэкт., створана 30 МТС, працуе на палёх 1.740 трактараў, пасеяна і ўбрана 240.000 гэкт. ільну і канапель.

Наша краіна падышла да рашаючага этапу сацыялістычнага будаўніцтва—да завяршэньня набудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР. Калгаснае селянства стала асноўным вытворцай с.-г. прадукцыі і сапраўды моцнай апорай партыі і савецкай улады на вёсцы.

Гэтыя перамогі сусьветна-гістарычнага значэньня здабыты ў рэзультаце няўхільнага і пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, палітыкі суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва як клясы. Гэтыя посьпехі здабыты партыяй у жорсткіх клясавых баёх супроць кулацтва, у непрымірымым змаганьні супроць правых і «левых» апартуністаў.

«Дзень калектывізацыі і ўраджаю» зьяўляецца днём масавага агляду посьпехаў і дасягненьняў сацыялістычнага зямляробства, днём масавай праверкі выкананьня заданьняў партыі і ўраду аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Гэты дзень павінен зьвяцца магутным фактарам павышэньня вытворчай актыўнасьці ўсіх працоўных мас на яшчэ больш шпаркае разьвіцьцё сацыялістычнай эканомікі СССР, на падцягваньне тых вучасткаў прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, якія адстаюць.

Перад вамі стаіць задача ўзмацняць свой пралетарскі ўплыў у сацыялістычнай перабудове вёскі. Перадавайце вопыт бальшавіцкіх тэмпаў і сацыялістычных мэтадаў працы перадавых фабрык і заводаў у падшэфныя калгасы і вёскі. Арганізуйце масавыя выезды ў «Дзень калектывізацыі і ўраджаю» для дапамогі калгасьнікам у іх змаганьні за новую сацыялістычную вёску. Трымайце і ў далейшым шчыльную сувязь з падшэфнымі калгасамі, дапамагайце ім у арганізацыі вытворчасьці, у правядзеньні мерапрыемстваў, накіраваных на арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калектываў.

«Дзень ураджаю і калектывізацыі» павінен прайсьці пад знакам узмоцненай барацьбы за выкананьне прамфінпляну, асабліва за поўную рэалізацыю праграм вырабу с.-г. машын.

Шпаркі рост, гіганцкія посьпехі калгаснага будаўніцтва патрабуюць няўхільнага ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў.

Умацаваць калгасы—гэта значыць правільна арганізаваць працу, укараніць зьдзельшчыну ва ўсіх відах работы, наладзіць яе дакладны ўлік, ліквідаваць абязьлічку, вытравіць з калгаснай практыкі дробна-буржуазную ўраўнілаўку.

Барацьба за аўладаньне агратэхнікай, за павышэньне ўраджайнасьці, за якасьць работы, за шырокае разгортваньне падрыхтоўкі кадраў сацыялістычнага зямляробства зьяўляецца баявой задачай дня ўсёй грамадзкасьці.

Арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў на даным этапе калгаснага будаўніцтва зьяўляецца галоўнай рашаючай задачай, практычнае вырашэньне якой вызначае сабою новыя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Разьмеркаваньне даходаў па працадняхх—асноўнае зьвяно арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, за якое зараз трэба ўхапіцца.

Толькі на аснове разьмеркаваньня даходаў па колькасьці і якасьці працы замацоўваецца зьдзельшчына, узьнімаецца прадукцыйнасьць працы, павышаюцца якасныя паказальнікі калгаснай вытворчасьці.

Разьмеркаваньне даходаў адбываецца ў абставінах жорсткага клясавага змаганьня. Кулацтва, зьмяніўшы сваю тактыку, бярэ курс на разбурэньне калгасаў з сярэдзіны, вядзе ўзмоцненую агітацыю за разьмеркаваньне ўраджаю па ядоцка-падушным прынцыпе. Гэтым самым кулацтва імкнецца сарваць арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў. Усякія праяўленьні ўраўнілаўкі, адкрытай або захаванай, ЦК разглядае, як праяўленьні кулацкага ўплыву. ЦК заклікае ўсю партыйную арганізацыю, усіх калгасьнікаў весьці самае бязьлітаснае змаганьне супроць ураўнілаўкі, у якімбы выглядзе яна не зьяўлялася. Разьмеркаваньне ўраджаю павінна быць узята пад суровы грамадзкі кантроль, павінна праводзіцца пры ўмовах няўхільнага захаваньня прынцыпу: «хто больш працуе, той больш і атрымлівае».

«Дзень калектывізацыі і ўраджаю» павінен зьвяцца магутным фактарам у справе ліквідацыі прарываў на фронце разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Неабходна ўзмацніць увагу ўсіх партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый да вырашэньня задач жывёлагадоўлі, асабліва сьвінагадоўлі, якая дае магчымасьць найбольш хутка вырашыць мясную праблему. Усямерная садзейнічаць пашырэньню стада, правядзеньне зоатэхнічных мерапрыемстваў, падрыхтоўка да зімоўкі жывёлы (будаўніцтва абораў і сьвінарнікаў), пашырэньне кармовай базы—вось самыя адказныя і ўдарныя вучасткі работы, куды трэба накіраваць усе лепшыя сілы рабочых саўгасаў і калгасьнікаў. Паставіць жывёлу пад стрэхі, забясьпечыць яе кармамі і ў першую чаргу сакавітымі—вось задача сёньнешняга дня. Вызначаная партыяй і ўрадам праграма сіласаваньня—мільён тон сіласу—зьяўляецца мінімальнай. Ніякіх падстаў для яе скарачэньня няма. Мы можам і павінны дабіцца ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня гэтай праграмы. Ад першых посьпехаў на фронце разьвіцьця жывёлагадоўлі да рашаючых перамог павінны ісьці шпаркімі тэмпамі саўгасы і калгасы.

Сваячасовая ўборка і загатоўка бульбы і гароднінны, апрацоўка і датэрміновая здача ільну, выкананьне плянаў загатоўкі збожжа, адгрузкі бульбы для Ленінграду — вакол гэтых кампаній трэба мабілізаваць ўсю калгасную і бядняцка-серадняцкую масу вёскі. У «Дзень калектывізацыі і ўраджаю» арганізуйце масавыя чырвоныя абозы ільну, збожжа, бульбы і інш. Ніводнага кілё збожжа, бульбы і гароднінны прыватніку. Памятайце, што пасьпяховае выкананьне плянаў загатовак збожжа, бульбы, ільну і інш. с.-г. прадукцыі дасьць яшчэ больш магчымасьці для паляпшэньня рабочага забесьпячэньня, дасьць фабрыкам і заводам сырэц для выпуску ў большых разьмерах тавараў шырокага спажываньня.

Раньняе зяблева — гэта барацьба за высокі ўраджай. Выразная ўпутрыбрыгадная арганізацыя працы ў саўгасах, МТС і калгасах, правільная расстаноўка сіл і ўмелае скарыстаньне сродкаў вытворчасьці ўзьнімаюць тэмпы сяўбы і зяблева. МТС, саўгасы і калгасы—на перадавыя пазыцыі сяўбы і зяблева!

Таварышы! Мы атрымалі буйныя перамогі, якія маюць сусьветнае гістарычнае значэньне. Мы бярэм крэпасьць за крэпасьцю ў разьвіцьці сацыялістычнай эканомікі. Наша краіна гіганцкімі крокамі рухаецца наперад па шляху сацыялізму.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б заклікае ўсіх рабочых, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў і ўсіх працоўных ператварыць «Дзень калектывізацыі і ўраджаю» ў дзень масавага агляду посьпехаў сацыялістычнага зямляробства, у дзень мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў вытворчасьці на ліквідацыю прарываў, у дзень масавага паходу за падцягваньне тых вучасткаў прамысловасьці і сельскай гаспадарк, якія адстаюць.

Таварышы! «Дзень калектывізацыі і ўраджаю» мы праводзім напярэдадні 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, напярэдадні найвялікшага сьвята ня толькі працоўных СССР, але і ўсяго сьвету. Найлепшым падарункам да 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі будзе поўнае выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьне плянаў загатовак на аснове шырокага разгортваньня сацспаборніцтва, поўнае і неадкладнае выкананьне дырэктыў партыі па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў.

Наперад, за разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце!

За канчатковую перамогу сацыялізму!

ЦК КП(б)Б.

„Усьлед за тым, як мы вырашылі праблему стварэньня буйнай гаспадаркі дзяржаўнай і калектыўнай, трэба па бальшавіцку ўзяцца за вырашэньне задачы атрыманьня высокіх ураджаяў на аснове ўжываньня ўсіх заваёў агранамічнай навукі“

(Якаўлеў)







Узмацнім пралетарскую дапамогу калгасу!

У „Дзень ураджаю і калектывізацыі“ арганізуем узаемную масавую праверку выкананьня абавязацельстваў шэфаў-прадпрыемстваў і падшэфных калгасаў

Мабілізуем усю рабочую грамадзкасьць на барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўзмацненьне калгасаў на аснове яшчэ большага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, за правільнае разьмеркаваньне калгасных даходаў, за далейшае ўцягненьне беднякоў і серадняковаў-аднаасобнікаў у калгасы, за выкананьне гаспадарча-вытворчых і культурна-бытавых задач на вёсцы, за ўкараненьне ў масы тэхнікі і агратэхнікі, за павялічэньне ўраджайнасьці, за ўздым сацыяльна-культурнага ўзроўню рабочых і калгасьнікаў!



Некалькі год таму назад камбайн быў невядомай машынай у СССР. Цяпер тысячы камбайнаў убіраюць збожжа з палёў нашых калгасаў і саўгасаў. Мы пачалі вырабляць свае савецкія камбайны. Запароскі завод «Камунар» выпусьціў зь 1929-30 г. некалькі соцень камбайнаў. Вялікія заводы камбайнаў будуюцца ў Саратаве і Нова-Сібірску. На саратаўскім заводзе ўжо сабран першы камбайн. Да ўборачнай кампаніі наступнага году саратаўскі завод дасьць 4.000 камбайнаў. Гэта будзе новая буйная перамога ў справе рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Да 14-ай гадавіны Кастрычніка гэта перамога ўжо ў асноўным ужо дасягнута. Хутка савецкі камбайн зусім выцісьне імпортныя машыны з палёў саўгасаў і калгасаў.

На здымку: Ударны камбайн Элекскага збожжасаўгасу (Сярэдня-Волскі край) за работай. У часе палявых работ гэты камбайн кожны дзень перавыконваў даную яму норму.

ІДЗЕ БАЯВАЯ ПАДРЫХТОЎКА

РЭСПУБЛІКАНСКІ КАМІТЭТ САЮЗУ РАБОЧЫХ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАЎ ВЫЗНАЧЫЎ РАД МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА ВЫКАНАНЬНІ ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ «ДНЯ ЎРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ».

ЦЭНТРАЛЬНАЕ ПРАЎЛЕНЬНЕ САЮЗУ ЗАКЛЮЧЫЛА ДАГАВОР ПА САЦСПАБОРНІЦТВЕ З ЗАХОДНІМ АБЛАСНЫМ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫМ САЮЗАМ. 25-га КАСТРЫЧНІКА НАКІРОЎВАЕЦЦА Ў ГОРАД СМАЛЕНСК СПЭЦЫЯЛЬНАЯ БРЫГАДА ЛЕПШЫХ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАЎ ПА ПРАВЕРЦЫ ХОДУ ВЫКАНАНЬНЯ ГЭТАГА ДАГАВОРУ. АБВЕШЧАН ДЭКАДНІК—З 15 ПА 25 КАСТРЫЧНІКА. 10 АДКАЗНЫХ РАБОТНІКАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА КАМІТЭТУ АБАВЯЗАЛІСЯ ВЫЕХАЦЬ У БОЛЬШ АДСТАЮЧЫЯ РАЁНЫ З МЭТАЙ НАЛАДЖВАНЬНЯ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ, ПАДЛІКУ ЎРАДЖАЮ Ў КАЛГАСАХ І САЎГАСАХ.

АРГАНІЗУЕЦЦА КОНКУРС НА ЛЕПШАГА РАБОЧАГА-ЎДАРНІКА Ў ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАХ. ВЫЗНАЧАН РАД ПРЭМІЙ КАШТОЎНАСЬЮ Ў 100.000 Р. НЕКАТОРЫЯ РАЁНЫ ЎЖО РАЗГАРНУЛІ БАЯВУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ КОНКУРСУ.

ПРЭЗЫДЫУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА ПРАЎЛЕНЬНЯ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАЎ ВЫПУСЬЦІЎ СПЭЦЫЯЛЬНУЮ ПАЗЫКУ «ЗА АЎЛАДАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ Ў ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАХ», ПА ЯКОЙ БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 15.000 РУБ. Ў ЯКАСЬЦІ ПРЭМІЙ ЗА ЛЕПШЫЯ ПОСЬПЕХІ Ў СПРАВЕ АЎЛАДАНЬНЯ ТЭХНІКАЙ.

КАРПУСЕНКА.

Машыны—уборачнай

У 4-м квартале ліквідаваць прарыў

Вёрасьнёўская праграма па выпуску сіласарэзак выканана на 99 проц.

Зараз перад заводам пастаўлена вялікая задача: у 4-м квартале ліквідаваць прарыў. Кастрычнік стаў паказальнікам здольнасьці рабочага калектыву «Гомсельмашу» працаваць пабальшавіцку. Крывая выкананьня прамфінпляну як па сіласарэзках, так і па саломарэзках значна пашла ўгару. Аднак ня ўсюды наладжана яшчэ работа. Мэханічны цэх дагэтуль яшчэ не паладзіў працы, каб поўнасьцю і своячасова забясьпечыць зборачыкаў добраякаснымі дэталямі. Дэталі, якія паступаюць зборачыкам з мэханічнага цэху, напалову бракаваныя. На 9 кастрычніка 1931 г. на Гомсельмашы знаходзіцца 1.489 машын, якія раскіданы на ўсім заводзкім дварэ. Машыны стаяць на дварэ, іржавеюць, ламаюцца і ня могуць быць адпраўлены за сдсутнасьцю вагонаў. Увесь зборачны цэх таксама застаўлены машынамі. Каб адправіць прадукцыю, што выпускаецца зараз і выпушчана ў 3 квартале Гомсельмашу трэба штодзённа грузіць 25 вагонаў, а завод атрымлівае па 4-5 вагонаў. На працягу трох дзён не падана ні аднаго вагона.

ГОМСЕЛЬМАШ. ВЫПУСК СІЛАСАРЭЗАК:	
Дзённае заданьне	24.
ВЫПУШЧАНА:	
8-га кастрычніка	27.
9-га кастрычніка	27.
10-га кастрычніка	27

Пералом у вырабе машын ёсьць. Для замацаваньня гэтага пералому трэба яшчэ больш разьвіваць ударныя тэмпы работы і наладзіць своячасовую падачу вагонаў.

Брыгадзір «Зьвязды»
А. Купрыянчык.

МТС—актыўныя ўдзельнікі „Дня ўраджаю і калектывізацыі“

Гэтымі днямі прэзыдыум цэнтральнага праўленьня МТС і батрацтва правёў спэцыяльную нараду па пытаньнях правядзеньня «Дня ўраджаю і калектывізацыі».

Пераважная большасьць рабчкомаў праводзіць баявую падрыхтоўку да «дня ўраджаю і калектывідацыі». Так, на сёньняшні дзень **Лёзьнянская, Лепельская, Тэнежыцкая, Смалявіцкая, Гарадоцкая, Аршанская** і іншыя МТС маюць узорныя паказальнікі падрыхтоўчай работы.

Лёзьнянскі рабчком МТС арганізаваў спэцыяльны штаб з прадстаўнікоў ад розных арганізацый і лепшых ударнікаў-рабочых на правядзеньні «дня ўраджаю і калектывізацыі». Штаб абвясьціў дэкадник з 1 па 13 кастрычніка па правядзеньні падліку ўраджаю, наладжаньні зьдзельшчыны ў калгасах і саўгасах. Намечана сілам работнікаў МТС арганізаваць у 5 сельсаветах выстаўкі, шырока абсталяваўшы іх дыяграмамі і плякатамі, у якіх усебакова павінны быць паказаны: выкананьне вытворчага пляну, загатоўкі, ўкамплектаваньне жывёлагадоўчых фэрм і забясьпячэньне іх кармамі, мабілізацыя сродкаў, рэалізацыя акцый Трактарацэнтру і інш..

Да «дня ўраджаю і калектывізацыі» прыстасавана перадача трактара МТС ад рэдакцыі часопісі «Работніца і калгасьніца Беларусі». Тры калгасы выканалі датэрмінова вытворчыя планы, а таксама 15 лепшых рабочых-ударнікаў будуць прэміяваны.

Работнікі **Лёзьнянскай** МТС абавязаліся на працягу дэкадніка «ўраджаю і калектывізацыі» правесьці ўдарную работу па скончэньні ўборкі бульбы і стопроцантным выкананьні загатовак.

Але побач з гэтым рад раённых рабчкомаў МТС праяўляюць бязьдзейнасьць у справе падрыхтоўкі і правядзеньня «дня ўраджаю і калектывізацыі». Так, **Сураская, Магілеўская, Кой данаўская** і іншыя МТС да гэтага часу ня маюць пяхіх канкрэтных выпікаў праведзенай работы.

Цэнтральнае праўленьне саюзу МТС і батрацтва слаба кіруе рабчкомамі. Некаторыя МТС да гэтага часу не атрымалі канкрэтных указаньняў з боку ЦП аб правядзеньні «дня ўраджаю і калектывізацыі».

Раптоўскі і Жывіцкі.

Мабілізаваць шырокія масы настаўніцтва

Настаўніцтва вёскі ў часе правядзеньня веснавой і асеньняй пасеўнай кампаніі, а таксама па ўборцы ўраджаю прарабіла вялізарную работу. Па БССР ёсьць рад выпадкаў, калі старшынямі калгасаў, членамі праўленьняў і рэвізійных камісій працуюць настаўнікі (Барысаўскі, Ельскі, Аршанскі, Бягомльскі і інш. раёны).



Гомсельмаш. Зборачны цэх сіласарэзак.

У радзе раёнаў пры актыўнай дапамозе асьветнікаў арганізаваны калгасы. Так, у Любаньскім і Плешчаніцкім раёнах арганізаваны настаўніцтвам калгас носіць назву **«Асьветнік»**. Асьветнікі прымаюць актыўны ўдзел у разьмеркаваньні ўраджаю, праводзе калгасаў на зьдзельшчыну. Талачынскі раймясцком для гэтай работы вылучыў 50 асоб. У Буда-Кашалёўскім раёне настаўніцтва вядзе растлумачальную работу сярод насельніцтва аб значэньні загатовак і арганізацыі чырвоных абозаў. Па кожным раёне вылучан адзін калгас для паказальнага культабслугоўваньня настаўніцтва. Таксама ўзяты для гэтай мэты дзьве МТС (Копысь і Койданава).

Удзел асьветнікаў у правядзеньні сьвята ўраджаю і калектывізацыі, як культурнай сілы на вёсцы, мае вялікае значэньне.

Скарыстаць такія формы работы, як арганізацыя ініцыятыўных груп, вярбовачных брыгад, індывідуальную работу сярод бядняцка-серадняцкіх мас і праз дзяцей для разгортваньня работы па далейшай калектывізацыі вёскі.

Праверыць выкананьне абавязацельстваў настаўніцтва перад калгасаўзам у галіне дапамогі калгасам. Таксама праверыць дагавары па палітэхнізацыі школы, уцягваючы ў гэту работу масы калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкае сялянства.

Узмацніць работу па культабслугоўваньні калгасаў, саўгасаў і МТС. Прыняць удзел у абслугоўваньні і арганізацыі сельска-гаспадарчай выстаўкі па раёне. Дабіцца пераварэньня **«Дня ўраджаю і калектывізацыі» ў масавае сьвята за новую калгасную вёску, за ўзмацненьне наўных калгасаў.**

Мясцовыя арганізацыі павінны выявіць лепшых асьветнікаў-ударнікаў барацьбітоў за калгасную вёску для прэміяваньня за добрую работу.

Усе культасьветныя ўстановы, асабліва палітасьветныя, павінны разгарнуць шырокую масавую растлумачальную работу вакол «Дня ўраджаю і калектывізацыі».

Т. Сыс.

Снопавязалка Растоўскага Сельмаша на пробным загоне ў рысовом саўгасе «Черкасском» (Славянскі р-н).

120 рахункаводаў—калгасам

Асноўнае зьвяно работы саюзу работнікаў дзяржаўных устаноў—гэта работа ў вёсцы, мабілізацыя прафсаюзных мас на пасьляховае выкананьне дырэктыў партыі аб калектывізацыі. ЦП саюзу паслала 120 рахункаводаў на паўтары месяцы ў калгасы для наладжаньня ўліку, справаздачнасьці, арганізацыі зьдзельнай аплаты працы і інш.

Саюз работнікаў дзяржаўных устаноў мабілізаваў увагу на аказаньне дапамогі прыгарадным гаспадаркам у веснавой і асеньняй сяўбе (прапорцы і ўборцы пасеваў). Дагэтуль па Менску і 11 раёнах БССР адпрацавана 6.520 працадзён.

ЦП саюзу і надалей мабілізуе прафсаюзную масу для практычнай дапамогі калгасам ва ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях, у прыватнасьці, па ўборцы ўраджаю і ўзмацненьні калгасаў.

Прэзыдыум ЦП прапанаваў буйнейшым РМК саюзу арганізаваць узорнае шэфства над калгасамі і перанесьці вопыт гэтай работы ў раёны.

На пасяджэньнях прэзыдыуму ЦП заслуханы даклады 18 РМК аб удзеле іх у гаспадарча-палітычных кампаніях у калгасах.

Адным з асноўных недахопаў зьяўляецца тое, што ЦП саюзу ня мае выстарчальнай інфармацыі з боку РМК аб іх рабоце, ня гледзячы на тое, што прымаліся рад мер у адносінах да паасобных МК. РМК невыстарчальна ўлічваюць работу паасобных членаў саюзу, якія працуюць на сяле.

Пытаньне аб дні ўраджаю і калектывізацыі ставіцца на прэзыдыуме ЦП. Прафарганізацыям даны ўказаньні па далейшым разгортваньні калектывізацыі вёсці, арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, наладжаньні ўліку і спрэвэздачнасьці ў калгасах, ліквідацыі прарываў па ўборцы ўраджаю і зяблевага ворыва. Таксама дзень ўказаньня аб рэалізацыі позыкі трацяга рашаючага і своячасовым зборы ўзносу 100-процантным охопе членаў нашага саюзу, якія маюць сувязь з сельскай гаспадаркай, калгасамі.

ПАТАПЕНКА.

У лячэбніцы „хворых“ трактараў

У самым цэнтры Менску, па Савецкай вуліцы, ёсьць двор, які з даўняга часу ня бачыў гарадзкога санітарнага інспектара. Тут няма памыйных ям, розныя адкіды выліваюцца жыхарамі трохпавярховых дамоў проста пад ног. Увесну і ўвосень на дварэ—пераразная праз. Высокія дамы не даюць матчымасьці сонечным праменьням высушыць глебу.

На гэтым дварэ знаходзіцца маленькае, падобнае да дравянога складзіка, памяшканьне. Яно закідана розным дэталяломам: коламі ад трактараў, памаранымі дэталямі нейкіх машын, госьці ў кутку накідаў скрынак з-пад бэлык і г. д. Відавочна, работнікі Мэталялому ніколі сюды не заглядвалі.

На гэты брудны двор штодзённа прыяжджаюць рабочыя саўгасаў, калгасьнікі, работнікі МТС—з настойлівай просьбай:

— Адрамантуйце матор, тыдзень, як трактар стаіць, а работы шмат...

Матор прымаюць у рамонт. У гэтым маленькім памяшканьні самы «хворы» матор прывозіцца ў поўную спраўнасьць і выходзіць адсюль зусім здаровым.

Стары кваліфікаваны рабочы, які некалі працаваў на ленінградзкіх заводах, а зараз мэханік гэтай майстэрні тав. Селязьнёў, робіць усё, каб скарацць тэрміны рамонту трактараў і паасобных частак да іх. Тав. Селязьнёў памятае такія выпадкі (а іх было нямала), калі прывозілі трактар у майстэрню і безнадзейна разводзілі рукамі:

— Мусіць, прыдзецца скласьці акт, а гэтай машыны нічога ня будзе...

— Нічога ня будзе з таго чалавека, о даёў да такога станоўішча машыны,—кажа тав. Селязьнёў.

Пасьля гэтага тав. Селязьнёў перадаў паламаны трактар ударнікам майстэрні з наказам — скончыць рамонт гэтай і каб якасьць рамонту была добрая.

Майстэрня прымала для рамонту нават такія маторы, якія былі прыгодны толькі на лом. Людзі з калгасаў і саўгасаў хадзілі па ўстановах і прасілі: замяняце матор, рамантаваць немагчыма. Але матор пападаў у майстэрні і выходзіў адтуль прыгодным яшчэ на шмат год работы.

Чаму абавязана майстэрня сваімі посьпехамі?

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва—вось мэтады работы майстэрні.

Тав. Стульба бярэ матор для капітальнага рамонту. Такі-ж матор бярэ рабочы Папіскула.

— Папіскула, даём спаборніцтва,—выклікае тав. Стульба.

— Даём, паглядзім,—адказвае тав. Папіскула.

— Ну, я ад вас таксама не адстану,—кажа малады рабочы тав. Бычкоўскі.

Для капітальнага рамонту матора вызначана 7 дзён. Але ўжо на чэцьверты дзень у часе абедзеннага перапынку тав. Стульба з задаволенай усьмешкай кліча мэханіка і просіць:—Прымі матор...

— Ужо зрабіў?—здзіўляецца мэханік і аглядвае адрамантаваны матор. Пасьля піша сабе ў кніжачку: «таз. Стульба выканаў работу закуратна».

А ўвечары таго-ж дня скончыў рамонт матора і тав. Папіскала. На некалькі хвілін пазьней скончыў работу і малады рабочы тав. Бычкоўскі.

З таго часу плянавае заданьне па рамонце матора з 7 дзён **скарацілася да 3-4 дзён.**

Адночы з саўгасаў «Шыкатовічы», імя Сталіна і «Негарэлае» прывезьлі для пераліўкі і расточкі карэнныя падшыпнікі. Майстар вызначыў тэрмін гэтай работы ў 3 дні. Рабочы Бычкоўскі высунуў **сустрэчны тэрмін—у паўтары** дні, а зрабіў на працягу **дзесяці гадзін.**

Калі з саўгасу ЦРК паведамілі, што трактар «Інтэрнацыянал» цэлы тыдзень не працуе і ня было каго паслаць для рамонту, бо ўсе былі заняты, рабочы тав. Янушкевіч згадзіўся пайсьці ў свой выходны дзень і за гэты дзень адрамантаваў трактар.

У саўгасе «Равайчы» пры перавозцы грузаў быў папсован магутны трактар «Камунар». Разьбіты быў поршань, сапнут каленчаты вал, нават выбіта пляцоўка, на якой устанаўліваецца магнета. Гэты трактар быў кінуты за 20 клм. ад саўгасу. Туды быў пасланы тав. Янушкевіч з заданьнем: за 3 дні адрамантаваць трактар. Ён заданьне выканаў у тэрмін і на гэтым-жа трактары прыехаў у саўгас.

Такіх ударнікаў у майстэрні шмат. Вось, напрыклад, тав. Плашчынскі, які добраахвотна зьнізіў расцэнкі на 12 проц. Токар Наскалаў, які абточвае каленчатыя валы на працягу 4-х гадзін замест 7 паводле пляну.

Так, на гэтым маленькім, брудным дварэ, у майстэрні, падобнай да дравянога складзіку, 35 рабочых ва многіх выпадках вырашаюць лёс таго ці іншага калгасу і саўгасу. Яны дапамагаюць хутчэйшай перабудове старой вёскі на сацыялістычны лад. Рабочыя майстэрні ліквідавалі ў сябе абзьлічку інструмантаў і варштатаў. Яны патрабуюць ліквідацыі абзьлічкі таксама і трактараў.

— Няхай нашыя калгасы і саўгасы выкананьць свае пляны так, як мы выконваем іх заказы на рамонт,—кажа мэханік тав. Селязьнёў. Замест 318 аб'ектаў рамонту, паводле пляну на 9 месяцаў, зроблена 383 аб'екты, г. зн., план выканан **на 120 проц.** На капітальны рамонт «Фардзона» павінна быць затрачана 10 рабочых дзён, фактычна ў сярэднім на рамонт ідзе ад 6 да 7 дзён. На рамонт трактара «Інтэрнацыянал» планам прадугледжана 45 дзён, а затрачваецца ў сярэднім 37 дзён.

Маленькія майстэрні маюць права гаварыцца сваёй работай у справе дапамогі калгасам і саўгасам выконваць свае пляны па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

А. МАНЬКОЎ.



Тав. СТУЛЬБА—ўдарнік майстэрань Белсаўгастрэсту.

Тав. ЯНУШКЕВІЧ—ударнік трактарных майстэрань Белсаўгастрэсту.



Тав. ПЛАШЧЫНЬКІ—ударнік майстэрань Белсаўгастрэсту.

Паход за эканомію гаручага і змазачнага

абвясьцілі лепельскія трактарысты

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ МТС

Эканомія гаручага і змазачнага пры рабоце на трактары непарыўна зьвязана з паляпшэньнем якасьці працы, са зьніжэньнем сабекошту адзінкі працы, з барацьбой за павышэньне ўраджайнасьці на калгасных палёх.

Ужываючы рацыянальнае скарыстоўваньне гаручага і змазачнага, мы дамо сваёй сацыялістычнай краіне тысячы тон з'эканомленай газы і масла, якія пойдуць на паскарэньне сацыялістычнай рэканструкцыі нашай сельскай гаспадаркі.

Для таго, каб выканаць дырэктывы нашай партыі і ўраду аб эканоміі гаручага і змазачнага, мы **абвяшчаем у дзень ураджаю і калектывізацыі шырокі паход за эканомію гаручага і змазачнага.** Мы ў парадку ўпартай барацьбы дабіваемся ня толькі посьпехаў у гэтай галінейшай справе, а замацаваўшы дасягненьні, будзем змагацца за новыя перамогі на фронце эканоміі.

Мы на сваёй МТС маем бальшавіцкія прыклады паасобных брыгад. Брыгада **Сельваноўскага** працуе круглыя суткі і дае 21 гадзіну карыснай працы. Адзін трактар маркі «Ф. П». узьнімае за суткі 4 гэкт. валежу супроць 3 гэкт. згодна нормы Трактарацэнтру. Выдатак гаручага на адзін гэктар складае 28 кгр. супроць 31 кгр. па нормах Трактарацэнтру. Змазачнага выдаткоўваецца 9 проц. супроць 9,5 проц. па норме.

Брыгады **Азаронка і Бояша** на сіласаваньні і на малацьбе даюць ня менш бліскучыя прыклады.

Перадавыя брыгады **Сельваноўскага, Азаронка і Бояша** дабіліся гэтых посьпехаў дзякуючы высокай працоўнай дысцыпліне, шырока разгорнутаму ўдарніцтву паміж брыгадамі і ўнутры брыгады, ліквідацыі абзьлічкі, згуртаваньню ўвагі вакол пытаньня эканоміі гаручага і змазачнага.

Дасягненьні асобных перадавых брыгад мы зробім дасягненьнем усёй нашай МТС. **Наш лёзунг — раўняйся на ўдарніка ў працы.**

Мы бярэм на сябе наступныя самаабавязацельствы:

1. Выбіраць больш прыгодныя масывы для работы трактара, дзе-б ён рабіў менш астановак і лішніх паваротаў і не падвяргаўся паломкам.

2. Устанавіць самы лепшы штодзенны догляд за трактарамі і прычадным інвэнтаром, бо толькі спраўная машына менш выдаткоўвае гаручага і змазачнага.

3. Выдаткоўваць газу і змазачныя выключна па прызначэньні, уніклуўшы страт пры перавозцы і на складах. Стала сачыць за захаваньнем гаручага ў калгасах.

4. Наліваць газу ў бак трактара з дапамогаю прылад, якія недапушчаюць разьліваньня газы.

5. Эканомна выдаткоўваць газу ў трактары шляхам правільнай рэгуліроўкі падачы газы.

Мы ставім перад сабою баявую задачу, за выкананьне якой усімі сіламі будзем змагацца — гэта эканоміць на 1 гэкт. тры кгр. газы, выдаткоўваючы 28 кгр. замест 31 па пляне. Эканоміць змазачнага 0,5 проц. на 1 гэкт., выдаткоўваючы 9 проц. замест 9,5 проц. па пляне.

Будзем высьвятляць растратчыкаў і на іх рахунак залічаць выдатак гаручага і змазачнага. Ударнікаў эканоміі гаручага будзем прэміяваць. Для гэтай мэты вылучаем прэміяльны фонд у суме 1.000 руб.

Мы зьвяртаемся да ўсіх МТС БССР з прапановай «Дзень ураджаю і калектывізацыі» ператварыць у самы шырокі паход за эканомію гаручага і змазачнага. Унасіце свае канкрэтныя прапановы аб выдатканьні гаручага і змазачнага. Давайце праз друк абменьвацца аб вопыце нашых дасягненьняў. Мы выклікаем усе МТС на сацспаборніцтва па эканоміі гаручага і змазачнага.

Калектыў Лепельскай МТС.

З'эканомілі 11474 кгр. газы

Буда-Кашалёўская трактарная калёна дасягнула вялізарных посьпехаў у справе эканоміі гаручага. Веснавую пасеўную кампанію на ўзорваньне 772 гэкт. згодна пляну Белкалгасцэнтру трэба было выдаткаваць 25.974 кгр. газы, выдаткавана 14.500 кгр., што дало эканомію ў 11.474 кгр.

Такой значнай эканоміі трактарная калёна дасягнула толькі дзякуючы заключанай сацумове з **Уваравіцкай калёнай**, дзякуючы сацспаборніцтву і ўдарніцтву паміж самімі трактарыстамі. Сацумова прадугледжвала хутчэйшае выкананьне пляну ворыва, якасьць працы і догляд за машынай, эканомнае выдаткаваньне гаручага.

У выніку гэтага калёна 772 гэкт. узарала за 33 дні замест 45 дзён, вызначаных па пляне. Лепшыя трактарысты прэміяваны.

З такім-жа посьпехам калёна праводзіць і асеньнюю кампанію. На гэты раз заключана ўмова з **Рагачоўскай МТС**. Адноўлена сацумова паміж трактарыстамі.

На 1 кастрычніка ёсьць наступныя характарныя паказальнікі:

Трактарыст тав. **Бенкульскі** пры ўзорваньні 93 гэкт. з'эканоміў 774 кгр. газы, тав. **Шаўцоў** пры ўзорваньні 64 гэкт. з'эканоміў 640 кгр., трактарыст Духаў пры ўзорваньні 56 гэкт. з'эканоміў 572 кгр. і г. д.

Загадчык калёны тав. Чыжанскі, сам добры трактарыст, ніколі не адыходзіць ад машыны, своячасова рэагуе на ўсякія капрызы трактара.

Па прыкладу Буда-Кашалёўскай трактарнай калёны пачалі змагацца з такой-жа ўдарнасьцю змагацца за эканомію гаручага і астатнія калёны БССР.

Брыгадзір «Зьвязды»
ДВАРЭЦКІ.

Зрыўшчыкі сіласаваньня

— Калгас імя Сьвярдлова, Рагачоўскага раёну, мае сіласную вежу на 1.000 тон. Закладзена пакуль што ўсяго 50 тон сіласу. Праўленьне калгасу матывуе гэта тым, што няма зялёнай масы. Між тым у калгасе не скарыстана бацьвіньне і бульбянік.

— У Тульгайцкім сельсавеце, Хойніцкага раёну, да сіласаваньня амаль не прыступалі. Сельсавет, парт'ячэйка і насьпешгазэта зусім ня цікавяцца забясьпячэньнем калгасаў кармамі. Маўчыць і раённая газэта.

— У Талачынскім раёне плян сіласаваньня выканан толькі на 50 проц. Паасобныя сельсаветы, як Крутлянскі, Пераваляцінскі, Бўлахаўскі, выканалі толькі 8 проц. пляну. Раённыя арганізацыі, парт'ячэйкі і сельсаветы справай сіласаваньня ня кіруюць.

Ільнанасеньне марнуецца на станцыі, а прамфінплян алейнаў зрываецца

На станцыі Хадасы накапілася каля 40 вагонаў ільнанасеньня, якое прывезена калгасамі і аднаасобнікамі. Райкапсаюз не падрыхтаваў памяшканьняў, у зьвязку з чым насеньне адпраўляецца назад у калгасы. Ёсьць выпадкі псаваньня ільнанасеньня. У той-жа час на алейных прамфінплянах зрываецца з-за неатрыманьня насеньня. Станцыя Хадасы ўпарта не дае вагонаў для перавозкі грузу на месца прызначэньня. Адпаведныя органы павінны безадкладна ўмяшацца ў гэту справу. Пробка на станцыі Хадасы павінна быць безадкладна ліквідавана.

Логвінаў.

Працоўныя Біра-Біджану вітаюць ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б АТРЫМАЎ ТЭЛЕГРАМУ НАСТУПНАГА ЗЬМЕСТУ:

«ПЭФУ БІРА-БІДЖАНУ ЦК КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ ГАРАЧАЕ ПРАЛЕТАРСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ АД ДРУГОЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ПРАФСАЮЗАЎ.

У БАРАЦЬБЕ ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ БІРА-БІДЖАН МЫ ЧАКАЕМ САПРАЎДНАЙ ДАПАМОГІ ПРАЛЕТАРАЎ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

ПРЭЗЫДЫУМ».

Салому ігнаруюць

СМАЛЯВІЧЫ. У калгасе «Новае жыцьцё» будуецца абора на 200 штук, але пры ціперашніх тэмпах будаўніцтва яна будзе закончана толькі ў будучым годзе. Член праўленьня калгасу партыец Корзун кажа: «Раз няма цьвікоў, дык абору ня скончым». А засталося толькі накрыць страху. Аб саломе праўленьне калгасу нават і ня думае, а ўсё чакае цьвікоў.

ЗА ВЫСОКАТАВАРНУЮ КАЛЕКТЫЎНУЮ ГАСПАДАРКУ

Накіруем вытворчую актыўнасьць мас калгасьнікаў на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне жывёлагадоўчых, ільнаводчых і плодагародных калгасаў

Разьмеркаваньнем даходаў па працаднёх замацуем зьдзельшчыну ва ўсіх галінах сельскай гаспадаркі і ўзьнімем якасьць працы калгасьнікаў на вышэйшую ступень

УДАРНІКІ „БАЛЬШАВІКА“

паказваюць падшэфным сельсаветам шляхі далейшых перамог

Чырвонасьцяжны завод «БАЛЬШАВІК» з кварталу ў квартал ідзе наперадзе ўсіх прадпрыемстваў БССР па выкананьні прамфінпляну. На 4 дні раней тэрміну ён выканаў праграму трэцяга кварталу трацяга рашаючага году пяцігодкі.

Атрымаўшы пераходны сьцяг ЦК ЦПСБ у першым квартале 1931 г., рабочы калектыў пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі моцна трымае яго ў сваіх руках.

Ударнікі «Бальшавіка» не абмяжоўваюцца выкананьнем толькі свайго прамфінпляну. Метады сваёй бальшавіцкай працы яны пераносяць у падшэфныя сельсаветы менскага раёну — **Самахвалаўскі і Гатаўскі.**

Першага лютага 1931 г. завод «Бальшавік» узяў шэфства над гэтымі сельсаветамі. Да кожнага населінча былі прымацаваны ўдарныя брыгады рабочых, якія сыстэматычна выяжджалі ў сельсаветы і дапамаглі сельпарткому і сельсаветам праводзіць мерапрыемствы партыі і ўраду.

Першага мая завод «Бальшавік» з гэтымі сельсаветамі заключыў узаемны сацыялістычны дагавор на лепшае выкананьне прамфінпляну, з аднаго боку, і перабудову сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад—з другога. Лепшаму сельсавету, які дабіецца рашаючых перамог, завод «Бальшавік» усталяваў пераходны сьцяг.

Сельсаветы пры самым актыўным удзеле партыйнага калектыву і ўдарнікаў заводу «Бальшавік» змагаліся за сьцяг. Гэтымі днямі адбылася ўрачыстая перадача пераходнага сьцягу Самахвалаўскаму **сельсавету**, які вышаў пераможцам на фронце сацспаборніцтва.

11-га кастрычніка, калі прагудзеў гудок, 35 лепшых ударнікаў заводу «Бальшавік» разам з трыкушнікам выехалі ў падшэфныя сельсаветы для перадачы сьцягу.

Многія хацелі траціць на сход, паслухаць, які-ж з сельсаветаў вышаў пераможцам, але памяшканьне клюбу, былой царквы, не ўмяшчала ўсіх жадаючых.

Старшыня конкурснай камісіі кораткі і ясна чытае вынікі. **Самахвалаўскі сельсавет вышаў пераможцам.** На сёньняшні дзень ён аб'ядноўвае у калгасы 62 проц. усяго насельніцтва. Сельсавет выканаў плян мясазагатовак на 100 проц., заданьне па рэалізацыі ільнікі «Трэці рашаючы»—на 130 проц. Плян зяблёва калгасамі выканан на 73,3 проц., сяўба скончана ў тэрмін.

Старшыня заўкому тав. **Кантаровіч** перадаў сьцяг старшыні сельсавету, сакратару камсамольскага калектыву і лепшаму ўдарніку-калгасьніку **Лойка.**

Перадаючы сьцяг барацьбітом на фронце калектывізацыі, выступаючыя асабліва падкрэсьлілі, што сьцяг зьяўляецца пераходным і ў любы момант можа быць заваяваны Гатаўскім сельсаветам.

«Барацьба за сьцяг ня спынена, барацьба разгортваецца»—заявіў сакратар калектыву заводу «Бальшавік» т. **Гелер.**

Старшыня Гатаўскага сельсавету, выступаючы на гэтым сходзе, з усёй рашучасьцю заявіў: «Мы мабілізаваны, каб на працягу месяца забрць пераходны сьцяг у самахвалаўцаў».

Тут-жа на сходзе былі прэміяваны лепшыя ўдарнікі-калгаснікі з калгасаў **«Ленінскі шлях», імя БАН, імя Варашылава,** Самахвалаўскага сельсавету з фонду, выдаленага рабочым калектывам заводу «Бальшавік».

***

Сьцяг у самахвалаўцаў. Барацьба за сьцяг ня спынена. Самахвалаўскі і Гатаўскі сельсаветы павінны зьвярнуць галоўную ўвагу на арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, якое дагэтуль яшчэ кульгае. Трэба ўкараніць зьдзельшчыну ва ўсе галіны сельска-гаспадарчай вытворчасьці, паладзіць выразны ўлік працы кожнага калгасьніка. Асабліваю ўвагі павінна заслужыць разьмеркаваньне даходаў па працаднёх. Ні ў якім разе не дапусьціць дробна-буржуазнай ураўнялаўкі, даць рашучы адпор тым, хто будзе імкнуцца яе працягнуць.

Калектыў заводу «Бальшавік» таксама павінен гэтыя задачы паставіць у цэнтр сваёй увагі.

Мы ўпэўнены, што той сельсавет, які рэалізуе пастаўленыя задачы па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, заваюе гэты пераходны сьцяг імя заводу «Бальшавік».

ХАРЫТОНЧЫК.

Узьняць ураджайнасьць сацыялістычных палёў

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі БССР падыходзіць да «Дня ўраджаю і калектывізацыі» з вялікімі дасягненьнямі. На 10 кастрычніка 49,7% бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб'яднана ў калгасы. На працягу 1931 году на палёх БССР працуе 1.740 трактароў. На тэрыторыі БССР будуецца 47 ільназаводаў. Мы ўжо маем на сёньняшні дзень арганізаванымі 1.392 СТФ з пагалоўем 63.000 штук і 916 МТФ з пагалоўем 65.274 штукі. Такім чынам БССР ідзе шпуільна па шляху сацыялістычнай рэканструкцыі і тэхнічнага пераўзбраеньня сельскай гаспадаркі, па шляху, намечаным партыяй і яе ленінскім ЦК.

Разьмеркаваньне даходаў у калгасах, якое зараз праводзіцца, паказвае рост таварнасьці калектыўнай гаспадаркі, павышэньне жыцьцёвага ўзроўню, паляпшэньне матар'яльнага становішча бядняцка-серадняцкіх мас, якія аб'ядналіся ў калгасы. Даходы ўступіўшых у калгасы аднаасобнікаў у выніку аднагадовай работы вырасьлі ў два-тры разы. Укараненьне зьдзельшчыны, уздым энтузіязму калгасьнікаў, шырока разгорнутае сацспаборніцтва і ўдарніцтва, асабліва ў старых калгасах і разьмеркаваньне даходаў па прапоўным прынцыпе значна ўзьнялі **прадукцыйнасьць працы** калгасьнікаў. Вынікам гэтага зьявілася тое, што **ўсе калгасы, якія разьмяркоўваюць свае даходы ўжо другі раз** павялічылі як даходнасьць усяго калгасу, так і даходнасьць кожнага калгасьніка на 50-60 проц.

Аднак, падагульваючы вынікі нашай работы ў «Дзень ураджаю і калектывізацыі» трэба канстатаваць, што ўсе тыя перавагі, якія дае буйная калектыўная гаспадарка, яшчэ не скарыстаны ў поўнай меры.

Тав. **Якаўлеў** на пашыраным пасяджэньні НКЗ СССР сказаў: **«усьпех за тым, як мы вырашылі праблему стваральньня буйной гаспадаркі дзяржаўнай і калектыўнай, трэба па-бальшавіцку ўзяцца за вырашэньне задачы атрыманьня высокіх ураджаяў на падставе ўжываньня ў саўгасах усіх завёў агранамічнай навукі».** Пастаўленая задача па **ўздыме ўраджайнасьці** сельскай гаспадаркі цалкам адносіцца і да БССР. Барацьба за ўраджайнасьць у нашых умовах мае **асаблівае** значэньне, калі ўзяць пад увагу, што ў нас вядучай галіной сельскай гаспадаркі зьяўляецца **жывёлагадоўля і тэхнічныя культуры.**

Папярэдніе даныя аб ураджайнасьці па БССР даюць наступны малюнак: ураджайнасьць на **збожжавых** ў калгасах вышэй аднаасобнікаў на 4,76%, у саўгасах у параўнаньні з калгасамі на 18,18%. На яравых калгасы даюць ураджай вышэй на 4,61%, а саўгасы вышэй калгасаў на 19,11%. Ясная справа, што пры наяўнасьці трактарнай цягі, с.-г. машын калгасы далёка апераджаюць скарысталі мэханізацыю і машынізацыю. У выніку ўзрост ураджайнасьці недастаткова, ніякі. Рост ураджайнасьці па саўгасах мы таксама ня можам прызнаць здавальняючым, магчымасьці ў саўгасах ёсьць даволі для таго, каб падвоіць прырост ураджайнасьці.

Сацыялістычная жывёлагадоўля патрабуе стварэньня моцнай кармавой базы. Пагалоўе стада ў нас увесь час расьце і будзе расьці. Калі мы ў гэтым годзе маем пагалоўе сьвіней у 63.000 штук, дык у 1932 г. мы павінны будзем арганізаваць 3.000 сьвінаводчых таварных фэрм з пагалоўем 300.000 сьвіноматак. На прыходзіцца многа даказваць, што існуючая ўраджайнасьць палёў далёка ня можа задаволіць патраб узрастаючай жывёлагадоўлі. Гэта ставіць перад намі **баявую задачу** весьці напружаную работу па падвышэньні ўраджайнасьці сацыялістычных палёў. Праводзячы пашырэньне пасеўнай плошчы за кошт засваеньня новых зямель, правядзеньня раскарчовак і прасьцейшай мэліярацыі, мы павінны скарыстоўваючы машынную тэхніку, кінуць усе сілы на паляпшэньне якасьці апрацоўкі глебы. Існуючыя да гэтага часу ў радзе месц адносіны да апрацоўкі глебы павінны быць карэнным чынам зьмешаны. Намечаны ўрадам плян па **под'ёме 1.650 тыс. гэктараў ЗЯБЛІВА** павінен **быць цалкам выканан.** Ад выкананьня гэтага заданьня ў значнай ступені будзе залежыць ураджай і свалчасовы пасеў яравых у веснавую пасеўную 1932 г. Усякая адцяжка, або неадыкананьне пляну зяблёва будзе адмоўна ўплываць на правядзеньне веснавой сяўбы.

Кожны работнік МТС, калгасу, саўгасу павінен усьвядоміць, што без паляпшэньня апрацоўкі глебы, без правядзеньня асноўных мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць павышэньне ўраджайнасьці, нельга дабіцца максымальнага ўраджаю. Зяблёва, раньняя і максымальна кароткая сяўба яравых, раньняя сяўба азімых і асабліва сяўба тэхкультур, ва ўстаноўленыя тэрміны, ў выніку дадуць нам дадаткова дзесяткі тон каштоўнейшых культур.

Мы маем у гэтым годзе ў некаторых калгасах нізкую ўраджайнасьць ільну.

Таму задачай усёй грамадзкасьці зьяўляецца: скарыстаць усе дасягненьні навукі і тэхнікі і кінуць усе сілы на **падняцьце ўраджайнасьці.** Таго, што тэхніка і агратэхніка ў нас невыстарчальна скарыстоўваецца — ня прыходзіцца многа даказваць. Мы яшчэ маем такія факты ў некаторых раёнах, дзе не зразумелі значэньня раньняй сяўбы, дзе супраціўляюцца скарыстаньню штучнага ўнаеньня, не жадаюць рабіць вапнаваньня і тарфаваньня глебы. Радзевая сяўба пры наяўнасьці сівазак займае яшчэ назначнае месца. Апрача таго, мы маем яшчэ факты дрэнных адносін да сартавазьня і пратручваньня насеньня.

Адна з важнейшых практычных задач, якая павінна быць вырашана ў бліжэйшы час — гэта ўстанаўленьне правільнага севазвароту ў нашых саўгасах і калгасах. Правільны **севазварот** ва ўмовах спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі, якая праводзіцца, павінен даць у бліжэйшыя гады максымальны рост ураджайнасьці, галоўным чынам, вядучых культур нашай сельскай гаспадаркі і, ў першую чаргу, ільну. Устанаўленьне правільнага севазвароту ў кожным калгасе, саўгасе павінна стаць справай усёй савецкай грамадзкасьці, усіх навуковых работнікаў і агранамі. Увядзеньне севазвароту павінна быць праведзена бяз усякіх замаруджваньняў, яно павінна напесьці зьнішчальны ўдар па рэшткох трохполкі, якая практыкавалася ў аднаасобных гаспадарках.

«Дзень ураджаю і калектывізацыі» павінен зьявіцца тым выходным тэрмінам, ад якога пачнецца напружаная работа ўсіх арганізацый за максымальную ўраджайнасьць нашых сацыялістычных палёў.

У гэтай рабоце прыклад павінны паказаць у першую чаргу **МТС** і саўгасы. Скарыстоўваючы наяўную мэханічную сілу і агранамічныя кадры, МТС і саўгасы павінны ўкараніць у практыку работы ўсіх калгасаў шырокае прыстасаваньне навуковых мэтадаў вядзеньня сельскай гаспадаркі.

Немалую ролю павінны адыграць у гэтай вялікай справе і пытаньні арганізацыі **працы.** Ліквідацыя абязьлічкі, укараненьне зьдзельшчыны ва ўсе галіны сельскай гаспадаркі, ліквідацыя абязьлічкі ў карыстаньні сельска-гаспадарчымі машынамі і трактарамі і на вучастках зямлі, якія апрацоўваюцца брыгадамі, правільны ўлік работы кожнага калгасьніка і трактарыста і разьмеркаваньне даходаў толькі па працаднёх — усе гэтыя мерапрыемствы павінны забясьпечыць максымальны ўзрост прадукцыйнасьці працы ў калгасах, значна ўзьняць якасьць работы.

«Мы атрымалі вялізарнейшыя перамогі ў галіне разьвіцьця саўгасаў. Мы застасавалі ў калгасах новую тэхніку і дзякуючы гэтаму рэвалюцыянізавалі разьвіцьцё ўсіх галін сельскай гаспадаркі. Мы аб'яднали большасьць сялян у калгасах і тым самым стварылі буйную гаспадарку ня толькі дзяржаўную, але і калектыўную, грамадзкую. На аснове саўгасаў і калгасаў наша краіна пайшла на шляху пашырэньня пасеўных плошчаў у тэмпах, нябачаных у гісторыі сьвету. Зараз мы павінны перайсьці да вырашэньня задачы вытворчага ўмацаваньня калгасаў, задачы шырокага прыстасаваньня агранамічнай навукі ў саўгасах і калгасах, задачы павышэньня ўраджаяў» (з прамовы тав. Якаўлева на пашыраным пасяджэньні калегіі НКЗ СССР).

Пастаўленая партыяй задача павышэньня ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі зьяўляецца адным з важнейшых мерапрыемстваў па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў. Кулак будзе імкнуцца перашкодзіць вырашэньню гэтай задачы. Ён будзе выступаць супроць аграмінімуму, супроць укараненьня агратэхнікі ў сельскую гаспадарку. Задача ўсіх арганізацый — мабілізаваць масы калгасьнікаў і ўзяцца па-баявому за работу па под'ёме ўраджайнасьці сацыялістычных палёў, заваўладаньне агратэхнікай і навукай, даючы руйнуючы адпор кулаку і яго агентам — антыўпістам. 1932 год павінен даць максымальны ўздым ураджайнасьці сацыялістычнай гаспадаркі.

МЯЛОЎ.

ЗАСТАЕМСЯ У БССР ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ

Ад ударнікаў украінцаў, прысланых на дапамогу калгасам БССР.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і ўраду мы ўдарнікі ўкраінцы ўзялі на сябе брацкі абавязак перанесьці свой вопыт у справе калектывізацыі і тым дапамагчы калгасам Беларусі.

Мы—КАСТЭНКА, ПАМАЗАН, ШАПЯЛЕНКА, ФІЛАМЕНКА, АРЦЁМЕНКА —працуючы ў Жыткавіцкім раёне старшынямі калгасаў і інструктарамі райкалгассаюзу, змаглі дабіцца значнага зруху ў справе калектывізацыі. Да нашага прыходу раён быў калектывізаваны на 29 проц., а на 1-е кастрычніка мы ўжо маем 56 проц.

Да нашага прыезду ў калгасах ня было зьдзельшчыны, скрозь панавала абязьлічка. Мы правялі ў гэтым напрамку вялікую работу. Уся наша работа была накіравана на ўкутры-калгасае ўмацаваньне.

Мы ўпарта змагаліся за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі і абяцаем у далейшым яшчэ больш настойліва працавацъ па замацаваньні посьпехаў калектывізацыі ў раёне. Мы застаёмся на пастаяннай рабоце ў БССР да канца пяцігодкі і выклікаем усіх камандыраваных украінцаў пасьледаваць нашаму прыкладу.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы і на-далей будзем упарта змагацца за суцэльную калектывізацыю БССР і ліквідацыю на гэтай аснове куляцтва як клясы.

Ударнікі—украінцы: КАСТЭНКА Г. В., ПАМАЗАН М. М., ШЭПІЛЕНКА І. В., ФІЛАНЕНКА А. В., АРЦЁМЕНКА.

***

Мы ударнікі-украінцы замацоўваем сябе на пастаяннай рабоце ў калгасах БСС да канца пяцігодкі выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу ўсіх нашых таварышоў украінцаў, якія былі прысланы разам з намі на работу ў Савецкую Беларусь.

Абяцаем па ранейшаму, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, змагацца за лінію партыі, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за суцэльную калектывізацыю гаспадарак БССР.

Ударнікі ўкраінцы: РЫБАК ІВАН, МІТРУСЕНКА ГРЫЦ, ЗАБУЛА ПАЎЛА.

Завершым перамогу ў барацьбе за тэхкультуры

Ільнаводзтва і канапляводзтва, як і жывёлагадоўля — адзін з асноўных напрамку спэцыялізацыі сацыялістычнай сельскай гаспадаркі БССР. На гэтым, як і на другіх вучастках сцыялістычнага будаўніцтва, у гэтым годзе атрыманы буйныя перамогі.

У выніку пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай вясны пасеўная плошча ільну павялічылася да 240.900 гэкт. супроць 127.458 гэкт. у мінулым годзе, і канапель да 40.042 гэкт. супроць 21.404 гэкт. у мінулым годзе. Калі паловы пасеву тэхнічных культур зроблена калгасамі, саўгасамі і МТС.

Вытворчы вопыт барацьбы за лён у мінулым годзе, арганізацыя работы на аснове зьдзельшчыны, шырокае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва — забясьпечылі калгасам, саўгасам і МТС перамогу і на адказьнейшым вучастку ўборкі тэхнічных культур.

Цераблеьне ільну ў гэтым годзе ў асноўным скончана непараўнальна раней, чым у мінулым годзе, хоць пасеўная плошча і ўзрасла амаль у два разы. Абсалютная большасьць раёнаў, калгасаў, саўгасаў і МТС скончылі апрацоўку ільнасаломы, давялі яе да трасты і разгортваюць пераапрацоўку ільнатрасты ў валакно. Пачаліся ільназагатоўкі.

Дасягнутыя посьпехі сацыялістычнай перабудовы ільнаканапляводчай гаспадаркі БССР зьявіліся вынікам правільнага ажыцьцяўленьня палітыкі партыі ў галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Гэтыя посьпехі сталі магчымымі толькі на аснове шырокага разгортваньня калектывізацыі сельскай гаспадаркі, арганізацыі ільнаводча-канапляводчых саўгасаў, калгасаў і МТС.

Неабходнай умовай далейшага буйнога росту сацыялістычнай сельскай гаспадаркі ільнаводчых раёнаў зьяўляецца ўмоцненая работа па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў. Пад такім кутом погляду трэба арганізоўваць далейшую ўпартую барацьбу за лён і канопліі. Атрыманыя ўжо посьпехі ў барацьбе за лён давесьці да пераможнага канца — да поўнай і датэрміновай здачы (продажу) дзяржаве таварнай прадукцыі ільну і канапель.

Наркамзем і Калгасцэнтр СССР у сваёй апошняй пастанове выразна падкрэсьлілі неабходнасьць: «у астатнія месяцы бягучага году (да 1 стуженя 1932 г.) неабходна правесьці сушку, мяцьцё і трапаньне асноўнай масы ўраджаю ільну і канапель з аднаасобнай пераапрацоўкай усёй рэшты трасты і саломы ўраджаю мінулага году».

Уся траста ў асноўным павінна быць пераапрацавана ў вызначаны тэрмін. Свалчасовая і поўная здача дзяржаве валакна ільну і пянькі дасягнецца асабліва ходнасьцю хутчэйшай мабілізацыі экспартных фондаў і бесьперапыннага абесьпячэньня нашай ільнанай прамысловасьці сырцом. Усё гэта патрабуе выключнай выразнасьці ў рабоце, арганізацыйнасьці кіраўніцтва і адказнасьці ўсіх арганізацый, якія вядуць перапрацоўку і загатоўку ільну і пянькі.

Класовы вораг, які атрымаў жорсткі ўдар у часе веснавой сяўбы і ўборачнай кампаніі, робіць спробы для таго, каб дазарганізаваць пераапрацоўку ільну і затармазіць здачу (продаж) валакна дзяржаве. Павышэньне класавай пільнасьці, руйнуючы ўдар па кулаку і агітуністах справа і «лева», шырокая мабілізацыя мас — асноўныя ўмовы правільнай арганізацыі работы на дадзеным рашаючым вучастку.

Правільна выкарыстаць і поўнасьцю загрузіць увесь наяўны інвэнтар, вычынаўшы з прасьпеўшых мялак, забясьпечыць мялкі густой сеткай сушалкі, правільна арганізаваць пастаянныя брыгады на сушцы, мяцьці і трапаньні ільну і наладзіць апэратыўнае кіраўніцтва на ільнаапрацоўчых пунктах — вось нашы задачы. На гэтым вучастку ў калгасах, на ільнаапрацоўных пунктах кулак будзе старацца найбольш шкодзіць. Ён павінен быць і будзе і тут разьбіты. Сюды ўсе сілы!

Прыкладамі ударнай работы па перапрацоўцы ільну калгасы ўжо паказалі высокую прадукцыйнасьць свайго працы. Яшчэ больш інтэнсыўнай праці на мяцьці, трапаньні і здачы ільну дзяржаве калгасы павінны паказаць аднаасобнікам новыя прыклады работы на аснове сацыялістычнай арганізацыі гаспадаркі. Гэта паслужыць новым стымулам для далейшай калектывізацыі.

Метады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва павінны стаць асноўнымі мэтадам правядзеньня ўсёй пераапрацоўкі ільну і здачы (продажу) валакна дзяржаве.

Пасьпяховае выкананьне ўсіх гэтых задач зьявіцца значным крокам уперад на шляху арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасу.

Лён, падняты са сьцяжынкаў, заразжа накіроўваць на ільнаапрацоўчыя пункты. Не дапусьціць перапалы трасты, аднак, сачыць і за тым, каб не гадымалася тая траста, якая яшчэ на полі лежалася. Зьмяты лён зараз-жа трапаць. Ніводнага дня не занягваць са здачай валакна. Арганізацыі масавых штодзённых чырвоных абозаў з ільном павінна стаць баявой справай пачатоўкі да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

«Дзень ураджаю і калектывізацыі» мы адзначаем перамогамі на пасеўнай і ўборачным фронтах барацьбы за Вялікую XIV гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі адзначым усебеларускім чынам абозам з ільном, апрацаваным кастрычніцкага і лістападаўскага плянаў.

Пераапрацаваць і здаць дзяржаве поўную масу ільну і пянькі да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі — кім павінен быць лёзунг калгасаў, саўгасаў, МТС і бядняцка-серадняцкіх ЗБССР **чадрыхтоўцы да сьвята** лістад.

А. М.

Працоўны... кніжка калгасьніка.

Сацыялістычныя мэтады працы—калгасам

У «Дзень ураджаю і калектывізацыі» ЦК саюзу зямляробых саўгасаў намеціў правесьці рад мерапрыемстваў у адпаведнасьці з выкананьнем пастановы ЦК КП(б)Б аб «Дні ўраджаю і калектывізацыі». ЦК саюзу разаслаў дырэктывы ўсім раённым камітэтам, у якіх прапануе мабілізаваць усіх калгасьнікаў і саўгаскіх рабочых па барацьбу за арганізацыйнае замацаваньне калгасаў, за далейшы рост калектывізацыі, правядзеньне зьдзельшчыны і падняцьцё ўраджаю ў калгасах.

Пры многіх раённых рабочых камітэтах створаны брыгады па заключэньні і перазаключэньні саддагаворў.

ЦК саюзу вызначыла рад прэмій для прэміяваньня лепшых ударных брыгад і рабочых ударнікаў, а таксама тых саўгасаў, якія першымі скончылі ўборку.

Шырока разгорнута работа па лініі аўладаньня агратэхнікай. 3.000 рабочых зямляробчых саўгасаў сіламі сацыялістаў у парадку грамадзкай работы падрыхтоўваюцца для кваліфікаваных работ па аграмерапрыемствах увесну 1932 году. Амаль пры кожным саўгасе створаны асобныя брыгады з удзелам спэцыялістаў для сыстэматычнай работы па павышэньні ўраджайнасьці і дапамозе падшэфным калгасам у справе правільнага ўліку работы, правядзеньня зьдзельшчыны і разьмеркаваньня ўраджаю.

Рабочыя калектывы некаторых саўгасаў узялі на сябе абавязацельствы па ўкараненьні ва ўсю работу калгасаў новых сацыялістычных мэтадаў работы, а таксама мабілізавана ўсім пралетарская грамадзкасьць на ліквідацыю прарываў па ўборцы ўраджаю, зяблёве, садзейнасьці выкананьню плану загатовак, па мабілізацыі сродкаў як у саўгасах, таксама і ў вакольных падшэфных калгасах і вёсках. Шырока разгорнута сацспаборніцтва, заключаюцца саддагавары.

Лашкевіч.

Рассаднік сацыялістычнай сьвінагадоўлі

Рабочы калектыў саўгасу „Івань“ паказвае сапраўды бальшавіцкія тэмпы ў барацьбе за сьвінагадоўлю.—Дзякуючы ўкараненьню зоавэтмінімуму і ўтрыманьню сьвінарнікаў у чыстаце, усё пагалоўе саўгасу—здаровае. Адыход маладняка зьніжан да 12 проц. Камсамольцы-ўдарнікі вядуць змаганьне за стопроцантнае захаваньне маладняка. Дасягненьні саўгасу „Івань“—ва ўсе саўгасы БССР!

За некалькі кілёмэтраў на захад ад Слуцку сярод лёсавых прысад шырока раскінуўся буйнейшы сьвінагадоўчы саўгас «Івань».

На так даўно на месца разбуранага вайною б. панскага гнязда прышлі новыя людзі. Цяжка было першыя гады. Дзень і ноч працавалі над адбудаваньнем зруйнаванай гаспадаркі. Спачатку ў саўгасе было толькі некалькі дзесяткаў сьвіней. Зараз саўгас стаў адным з буйнейшых рассаднікаў племяннай сьвінагадоўлі ў БССР.

706 сьвіней розных узростаў, з іх 200 дарослых матак. 9 вытворнікаў і 497 падсьвінкаў—вось стан саўгасу.

У саўгасе шырока разгарнулася будаўніцтва. Некалькі сьвінарнікаў уже поўнасьцю закончаны. Рэшта будзе закончана на працягу бліжэйшых тыдняў.

Крыху здалёк ад цэнтру саўгасу стаіць у рад некалькі старых сьвінарнікаў. Першае, што кідаецца ў вочы, калі заходзіш у сьвінарнік, гэта яго чыстата. Сьцены чыста выбелены. Кожная сьвінаматка мае асобную камору. Пры ўваходзе ў кожную сьвінарніку ёсьць дэзынфэкцыйныя падушкі. Ачыстка праводзіцца штодзенна.

Кожная сьвінарка, якая даглядае сьвіней, адначасова сочыць за чыстатою ў сьвінарніку. За даручаную ёй працу сьвінарка нясе поўную адказнасьць.

Усе слабыя і захварэўшыя сьвіньні забіраюцца з агульных памяшканьняў, што папярэджвае пашырэньне захворваньняў.

Вэтэрынарнае абслугоўваньне саўгасу пастаўлена вельмі добра. Кожную пяцідзённую ўсе сьвіньні пераглядаюцца вэтэрынарам і робяцца неабходныя прышчэпкі. Усе зоатэхнічныя мерапрыемствы рэгулярна і свалчасова праводзяцца ў жыцьцё. У выніку ўсё стада саўгасу здаровае. Спэцыяльна прысланы прадстаўнік Племжывёлаводзтрэсту для абсьледаваньня і выбракоўкі сьвіней, на вялікае сваё здзіўленьне заявіў, што «ў саўгасе няма чаго выбракоўваць».

Зараз у саўгасе праводзіцца адказьнейшы этап работы—правядзеньне асенньй-зімовых апаросаў. Асеньнія апаросы пачаліся ўжо. Сьвіньні пароспцца ў спэцыяльна-абсталяваным для гэтай мэты матачніку. Уся работа праводзіцца мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Зімовы апарос пачнецца ў саўгасе з 1-га сьнежня. Да правядзеньня яго саўгас загадзя падрыхтаваўся. Ужо на сёньняшні дзень поўнасьцю скончаны пабудовай два ацэпленыя матачнікі. Будаўніцтва трэцяга матачніка выканана на 80 проц.

Да правядзеньня злучной кампаніі, якая пачнецца з 15-20 кастрычніка, папярэдняя работа закончана. Выпрацаван дэтальны плян работы, які абгаворан на апульным сходзе і даведзен да кожнага саўгасьніка.

Барацьба за мінімальны адыход маладзьняка ў апошнія часы стала стрыжнем усёй работы рабочага калектыву. Процант адыходу складае 12-15. Саўгасьнікі абавязваюцца адзначыць 14-ю галавіну Кастрычніка зьніжаньнем адыходу да мінімуму. Абслугоўваючы сьвінарнікі пэрсанал абвясьціў сябе ўдарным у барацьбе за 100 проц. захаваньне маладняка.

Не на апошнім месцы у саўгасе стаіць забясьпячэньне жывёлы кармамі. Заданьне трэсту па сіласаваньні ў 225 тон выканана на 100 проц. Саўгасьнікі абяцаюць гэтымі днямі засілаваць яшчэ адну яму звыш пляну.

Вялікую работу па сіласаваньні правяла камсамольская ячэйка саўгасу, сіламі якое засілавана амаль уся вызначаная колькасьць. «Каб не яны,— расказваюць рабочыя саўгасу,—дык-бы наша жывёла засталася бяз сілясу».

Камсамольцы і беспартыйная моладзь саўгасу па-баявому ўзяліся за сілас, у выніку ігравічнай работы пляначае заданьне выканана. Зараз распачынаецца капаньне траншэй ямы на 100-120 тон звыш пляну. Уся сенажаць убрана поўнасьцю і свалчасова. Уборка другога ўкосу праходзіць таксама па-ўдарнаму.

Гэтыя мерапрыемствы гарантуюць поўнае забясьпячэньне жывёлы саўгасу кармамі.

Да зімоўкі жывёлы саўгас поўнасьцю падрыхтаваўся. Усе аборы і сьвінарнікі ацэплены. Праведзены сходы сьвінарак па пытаньнях падрыхтоўкі да зімаваньня жывёлы. Для абслугоўваючага пэрсаналу ёсьць спэцыяльная вопратка для працы ўзімку. У сьвінарніках праведзен рад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў для палягчэньня работы. 90 проц. усіх рабочых на сьвінарніках—камсамольцы, якія заўсёды знаходзяцца ў авангардзе. Вось камсамолка-ўдарніца Доўбік Волька, працуе на сьвінарніку ўжо некалькі год. За ўвесь час яе мела ніводнага спагнаньня і парушэньня дысцыпліны. Як відаць з разрахунковай кніжкі, яна не зрабіла ніводнага прагулу і спазьненьня. За прыкладную працу прэміявана.

Не адстае ад тав. Доўбік і другая сьвінарка-ўдарніца, камсамолка Тупіна Мар'я. Камсамольцы паказваюць прыклад узорнай працы для ўсіх іншых рабочых саўгасу. Свалчасовая і акуратная ўхва на працу, надзвычай добрыя адносіны да выкананьня даручанай работы—вось вымяральнікі, якімі можна ахарактарызаваць работу камсамольцаў сьвінасаўгасу «Івань».

Парт'ячэйка ў апошні час разгарнула належнае апэрацыйнае кіраўніцтва працай. Амаль на кожным пасяджэньні бюро і агульным сходзе ячэйкі КП(б)Б ставіліся пытаньні аб становішчы сьвінагадоўлі. Ні адно з важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўраду па разьвіцьці жывёлагадоўлі не прайшло міма ўвагі парт'ячэйкі.

Хаця асноўная галіна ў саўгасе—сьвінагадоўля, аднак, не забыты і іншыя галіны жывёлагадоўлі. У саўгасе ёсьць значнае стада буйной рагатай жывёлы. Утрыманьне яго, як і сьвіней, пастаўлена вельмі добра. Тры старыя аборы ўжо адрамантаваны. Канчаецца будаўніцтва новых. Спэцыяльныя рабочыя ўвесь дзень даглядаюць жывёлу і за гэта нясуць поўную матар'яльную адказнасьць.

Конская цягавая сіла займае значнае месца ў гаспадарцы. Большая частка палёвых работ была праведзена выключна коньмі, і догляд коняй пастаўлен у гаспадарцы на належную вышыню. Спэцыяльна вылучаны рабочы сочыць за свалчасовым кармленьнем і нармальнай нагрузкай коня. Коні скарыстоўваюцца рацыянальна і правільна. Гадзявыя жэрабят праходзіць пад пільным наглядам зоатэхніка. Пасасобныя сьвінарнікі, аборы і стайні заключылі паміж сабою дагавары аб сацспаборніцтве на лепшы догляд жывёлы і 100-проц. захоўваньне маладняка.

Заданьне трэсту на здачы племяннай прадукцыі саўгасам выканана за ўсе тры кварталы на 100 проц. Заданьне чацьвертага кварталу ў 150 племянных сьвіноматак саўгасьнікі абяцаюць выканаць і перавыканаць. Зацікаўленасьць кожнага з іх, шырокае разгорнутае сацспаборніцтва і ўдарніцтва—гэтаму зарука.

Тут-жа ў саўгасе ёсьць свой клюб, дзе існуюць гурткі для саўгасьнікаў па павышэньні кваліфікацыі, бягучай палітыцы і інш. Саўгасьнікі гутарадь па пытаньнях, якія цікавяць іх, з зоатэхнікам, другім радцам з ветдактарам. Наогул кожны рабочы волны ад працы час скарыстоўвае для набыцьця і папаўненьня сваіх ведаў.

Ня так даўно ў саўгасе адкрыта для рабочых свая сталоўка. Гэта вызваліла жанчын ад кухні і дало ім магчымасьць прымаць удзел нароўні з мужчынамі ў правядзеньні ўсіх работ. Большасьць саўгасьнікаў пераведзены з цёмных брудных кватэр, у якіх яны жылі раней, у новазабудаваныя, сьветлыя інтэрнаты. Рэшта рабочых будзе забясьпечана поўнасьцю кватэрамі на працягу 1931-32 г.

Такіх блёкучых вынікаў сьвінасаўгас «Івань» дасягнуў дзякуючы надзвычай добра пастаўленай арганізацыі працы. На ўсе галіны работы ў саўгасе ўведзены зьдзельныя нормы з улікам якасных паказальнікаў, г. зн. што пры ўліку выкананьня даручанай працы кожнага рабочага галоўная ўвага зварочваецца на якасьць яе. Гэтым у поўнай меры стымулюецца барацьба за лепшы догляд жывёлы і 100 проц. захаваньне маладняка.

Па арганізацыі ўліку працы саўгас «Івань» можа быць прыкладам для ўсіх саўгасаў Савецкай Беларусі. Кожнаму саўгасьніку выдана разрахунковая кніжка, у якую штодзенна запісваецца выкананая работа.

***

Вечарэла, калі мы выехалі з прысад саўгасу. Лёгкая грязь лясала аб колы возу. Цішыня. Толькі з боку саўгасу чуваць дзявочыя галасы і сьпевы гармоніка. З вялізных вокан былога панскага палацу струменем б'е сьвятло. Гэта партыйцы і камсамольцы сабраліся на свой чарговы сход, каб абгавар

Год выданьня—XV
№ 280 (4186)
Серада, 14 кастрычніка
Цана нумара 6 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Органа ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І ПАЎТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 68.
Тэлефоны
рэдактар—4-27, сакратар—10-74, партсакратар—13-80, прамысл.—13-80, сяк. гасп.—6-19, мась. інфарм.—6-19, замест. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжнародны інфармацыі—10-74, адказны рэдактар—7-81, адказны рэдактар—7-81

„З капіталістаў ні грошы — усе падаткі на працоўных"

вось зьмест новых дэкрэтаў польскага ўраду

Узмоцненая падрыхтоўка

да вайны ў Польшчы

ВАРШАВА, 11. 7-IX, на пасяджэньні бюджэтнай камісіі сойму рабіў даклад міністар фінансаў Ян Пілсудзкі і віцэ-міністар фінансаў—Завадзкі. Ян Пілсудзкі заявіў, што дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту за першае паўгодзьдзе 1931 г. складае 124 млн. злотых. Пілсудзкі лічыць аднак, што на працягу бліжэйшых месяцаў наступіць павялічэньне фінансавых уплываў, а гэта дазваляе спадзявацца, што наступіць раўнавага ў дзяржаўным бюджэце.

Віцэ-міністар Завадзкі прапанаваў ПАНІЗІЦЬ на палову прамысловы падатак, супроць якога выступалі саюзы прамысловцаў і значна ПАВЯЛІЧЫЦЬ падатак ад даходу, які галоўным чынам зьбіраецца з гаподных заработкаў рабочых, служачых і шматмільённай масы вясковай беднаты. Павялічэньне даходнага падатку прынясе фашысцкаму ўраду 55 млн. злотых. Гэта зьяўляецца новым цяжарам, які зваліцца на плечы найбяднейшых пластоў насельніцтва.

На гэтым-жа пасяджэньні бюджэтная камісія зацьвердзіла ўрадавы праект закону аб устрыманьні ад 30 чэрвеня аўтаматычнага павышэньня пэнсіі дзяржаўным служачым. Гэты закон адбірае ад дзяржаўных служачых 12 МЛН. ЗЛОТЫХ У ГОД.

Акрамя гэтага камісія павысіла падатак ад нярухомай маемасьці на 10 проц. У бліжэйшы час наступіць павышэньне раду пасярэдніх падаткаў («спажывецкіх») на віно, піва, мёд, кватэрная плата і г. д.

«Гаспадарчыя колы» вылічваюць, што павышэньне падаткаў дасьць суму каля 250 млн. злотых у год.

8-га верасьня быў абвешчан дэкрэт рады міністраў аб увядзеньні спэцыяльнага падатку, гэтак званага вайсковага. На падставе гэтага дэкрэту кожны, хто будзе цалкам, або часткова звольнены ад вайсковай павіннасьці,—павінен плаціць спэцыяльны падатак ад даходу ў разьмерах ад 1,2 проц. да 2 проц. свайго гадавога даходу.

Мілітарызацыя чыгунак у Польшчы

ВАРШАВА, 12. Міністэрства ваенных спраў унесла ў сойм законапраект, які ўпаўнаважвае раду міністраў мілітарызаваць усе польскія чыгуначныя шляхі ў часе вайны, у выпадку, калі міністэрства ваенных спраў і рада міністраў прыцнае гэта неабходным. У такіх выпадках па прапанове міністра ваенных спраў выдаецца распараджэньне аб пад'ёме ваенных чыгуначных служачых ваенным уладам. Тады ўсе чыгуначныя служачыя паступаюць на ваенную службу, прымаюць ваенную прысягу і падпарадкоўваюцца ваенным уладам.

На вечную катаргу

ВАРШАВА, 13. У САМБОРСКІМ ВАЕННА-ПАЛЯВЫМ СУДЗЕ (Зах. Украіна) скончыўся працэс МІКАЛАЯ САЛТЫШЧЫКА, абвінавачанага ў сабатажы. САЛТЫШЧЫК, быццам, сьпіляваў 24 тэлеграфныя слупы. Ваенна-палявы суд прыгаварыў МІКАЛАЯ САЛТЫШЧЫКА НА ВЕЧНУЮ КАТАРГУ.

Польская прэса паведамляе, што 19 кастрычніка ў ЛЬВОВЕ распачнецца вялікі працэс украінскіх сабатажыстаў на чале са студэнтам БАГДАНАМ КРАВЦІВЫМ. Падсудных абвінавачваюць у ЗАБОЙСТВЕ ПАЛІЦЭЙСКАГА.

Працэс выклікае ў Львове вялікую зацікаўленасьць.

Пілсудзкі „папраўляе здароўе"... у Румыніі

ВАРШАВА, 12. Учора маршал Пілсудзкі нечакана выехаў у Румынію, як афіцыяльна паведамляецца,—«для папраўленьня здароўя». Пастанова аб паездцы Пілсудзкага была прынята так хутка, што незадома нават у жоны маршала Пілсудзкі правядзе свой водпуск Цыркулююць чуткі аб магчымай паездзе Пілсудзкага ў Эгіпэт.

Новае выступленьне супроць акупантаў у Зах. Беларусі

ВАРШАВА, 12. Выступленьні супроць акупантаў у Заходняй Беларусі, якія (выступленьні) носяць характар партызанскай барацьбы ўсё часьцей паўтараюцца.

Так «Газэта Варшаўска» ад 11 кастрычніка паведамляе, што на чыгуначным шляху **ГОРАДНЯ-НОВАЯ-КАМЕННАЯ** за некалькі хвілін перад падыходам цягніка ня выкрытыя вінаўнікі зрабілі насып з каменьня і жалеза.

На месца замаху выехаў амаль увесь апарат гораднзонскай дэфэнзывы. Праводзены масавыя арышты.

Масавыя арышты ў Вільні ня спыняюцца

ВАРШАВА. 13. Паводле паведамленьня «ГАЗЭТЫ ВАРШАЎСКАЙ» ад 11 кастрычніка, у Вільні арышты, якія ўжо працягваюцца некалькі дзён, — НЯ СПЫНЯЮЦЦА.

Арыштавана зноў НЕКАЛЬКІ ДЗЕСЯТКАЎ асоб сярод рабочых, беспрацоўных, школьнай моладзі і працоўнай інтэлігенцыі.

Група з 30 ЧАЛАВЕК арыштаваных пасаджана ў ЛУКІСКУЮ ТУРМУ.

Бязьмерны цынізм!

Нота Японскага ўраду

ТОКІЁ, 13. У сваім адказе Ліге Нацый, пасланым учора японскаму прадстаўніку ў Жэневе Іосіаве, японскі ўрад падкрэсьлівае і лічыць, што канфлікт можа быць выраблен у здавальняючым сэнсе толькі ў непасрэдных перагаворах паміж Японіяй і Кітаем. У японскай ноце далей гаворыцца, што ваенныя дзеяньні японскіх войск у Манчжурыі ў цяперашні момант у агульным закончаны і што японскі ўрад не знаходзіць ніякіх аднак ненармальнага становішча ў Манчжурыі. Перасоўваньне японскіх войск у розныя раёны, што знаходзяцца ў зоны паўдзіва-манчжурскай чыгункі, выклікаліся неабходнасьцю абароны карайскага насельніцтва. Інцыдэнт у Цэньтоў нельга тлумачыць як які не-будзь ужны інцыдэнт, а трэба ацэньваць яго, як дробную падзею. Японскі ўрад лічыць памылковай ацэнку падзеі ў Цзіньчжоў ізаляванa ад усёй абстаноўкі.

Паведамленьне, быццам становішча абвастрылася ў выніку адпраўкі японскіх ваенных суднаў на Яцзы, не адпавядае сапраўднасьці. Наадварот, сам Кітай ускладняе сытуацыю, дапускаючы антысавецкі рух у Кітаі і ў Манчжурыі. Японскі ўрад праявіў вялікую цярплівасьць і паслаў свае ваенныя судны толькі для абароны японскіх грамадзян. Японская нота асабліва пад крэсьлівае, што «гэты крок цалкам адпавядае пратэстантам, устаноўленым іншымі дзяржавамі ў падобнай-жа абстаноўцы». Становішча Манчжурыі ў цяперашні час такое, што вельмі затрудняе аднаўленьне там парадку.

17-га кастрычніка Усебеларуская нарада рэдактароў.

17-га кастрычніка г. г. у памяшканьні Малой Залі ЦК Культпропам ЦК КП(б)Б склікаецца

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА

Рэдактароў цэнтральных, гарадзкіх і раённых газэт БССР

з абавязковым удзелам **УСІХ** камуністаў-работнікаў цэнтральных газэт, рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражных газэт гор. Менску і студэнтаў газэтнага аддзяленьня Камвузу імя Леніна.

— ПАРАДАК ДНЯ: —

1. Уступная прамова сакратара ЦК КП(б)Б тав. **ШАРАНГОВІЧА.**
2. Перавыбары парторганаў і задачы цэнтральнага і раённага друку дакл. тав. **ГУРЭВІЧ.**
3. Паведамленьні рэдактароў **УСІХ** цэнтральных і раённых газэт аб ходзе арганізацыі штодзённых насьценных газэт і аб канкрэтнай дапамозе ім з боку рэдакцый.

На нараду выклікаюцца рэдактары наступных гарадзкіх і раённых газэт: Гомель, Віцебск, Бабруйск, Барысаў, Рэчыца, Магілеў, Полацк, Слуцак, Ворша, Дубровна, Лёзна, Шклоў, Буда-Кашалёва, Жлобін, Крычаў, Рагачоў, Чэрвень, Брагін, Лагойск, Горкі, Старыя Дарогі, Плешчаніцы, Камарына, Мазыр, Петрыкаў, Пухавічы, Старобін, Чураў, Чырвоная Слабада, Гарадок, Талочына.

Пачатак нарады—роўна ў **5** гадз. вечара (рэгістрацыя за 30 мін. да пачатку пасяджэньня).

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

175.000 тон бульбы Ленінграду

ПАТОКАМІ ЧЫРВОНЫХ ЭШАЛЕНАЎ

выканаем абавязацельствы перад ленінградзкім пралетарыятам

ЖЛОБІНСКІ КАМСАМОЛ—ПРАЛЕТАРАМ ЛЕНІНГРАДУ

ЖЛОБІН, 13. (БЕЛТА). Жлобінскі камсамол уключыўся ў трохдзеньнік уборкі і адгрузкі бульбы, абвешчаны ЦК КП(б)Б, СНК БССР і ЦСПСБ. Пры райкоме створан раённы штаб правядзеньня трохдзеньніка.

Да XIV гадавіны Кастрычніка арганізуецца камсамольскі эшалён з бульбай у ліку 45 вагонаў для пралетараў Ленінграду. Гэты эшалён будзе суправаджаць камсамольская чыгуначная брыгада. Уся камсамольская арганізацыя мабілізавана на сваячасовую падрыхтоўку эшалёну.

Каля 500 чалавек камсамольцаў, піянэраў і вучняў працуюць на палёх саўгасаў і калгасаў па ўборцы бульбы.

Райком ЛКСМБ мабілізаваў 50 чалавек раённага актыву для дапамогі сельсаветам і ячэйкам ЛКСМ у правядзеньні гэтай баявой кампаніі.

Адгружана 325 тон

ПЛЕШЧАНІЦЫ, 13. (Па тэлефону).

ЦК КП(б)Б тав. Шаранговічу, СНК БССР тав. Гападзеду, старшыні ЦВК тав. Чарвякову, ЦО „Зьвязьдзе"

Дзякуючы няўхільнаму правядзеньню ў жыцьцё генэральнай лініі партыі ў справе мабілізацыі партыйных арганізацый, савецкіх органаў і шырокіх пластоў калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на бязьлітасную барацьбу з супраціўленьнямі клясавага ворага, у барацьбе за бальшавіцкія тэмпы загатовак Плешчаніцкі раён дабіўся рашаючай перамогі ў адпраўцы бульбы пралетарыяту Ленінграду. ДА 11 КАСТРЫЧНІКА АДГРУЖАНА ДЛЯ ЛЕНІНГРАДА 325 ТОН ПРЫ ПЛЯНАВЫМ ЗАДАНЬНІ Ў 256 ТОН, АБО 123 ПРОЦ. ПЛЯНУ. Працягваем далейшую адпраўку.

Сакратар РК КП(б)Б ПАПЯНКОЎ.
Старшыня РВК ЛУК'ЯНЧЫК.

Рыхтуем трэці чырвоны эшалён

БАБРУЙСК. (Па тэлефону).

11 КАСТРЫЧНІКА З БАБРУЙСКУ АДПРАЎЛЕН ДРУГІ ЭШАЛЁН БУЛЬБЫ Ў КОЛЬКАСЬЦІ 32 ВАГОНАЎ ДЛЯ ЛЕНІНГРАДУ. 12 КАСТРЫЧНІКА АДГРУЖАНА ДАДАТКОВА 8 ВАГОНАЎ.

ЗАРАЗ У РАЁНЕ ПА-БАЯВОМУ РЫХТУЕЦЦА ТРЭЦІ ЭШАЛЁН З БУЛЬБАЙ, ЯКІ ПАВІНЕН БЫЦЬ АДПРАЎЛЕН 18 КАСТРЫЧНІКА. НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ЗАДАНЬНЕ ПА АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ ВЫКАНАНА НА 75 ПРОЦ.

А. МАГІДАЎ.

Працоўныя Шклоўшчыны адправілі Ленінграду 46 вагонаў бульбы

ШКЛОЎ. (Па тэлеграфу).

11-га КАСТРЫЧНІКА ШКЛОЎСКІ РАЁН АДПРАВІЎ ПРАЛЕТАРАМ ЛЕНІНГРАДУ ЧЫРВОНЫ ЭШАЛЕН З БУЛЬБАЙ У ЛІКУ 46 ВАГОНАЎ (800 ТОН).

ЭШАЛЁН СУПРАВАДЖАЮЦЬ ДЭЛЕГАТЫ РАБОЧЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ — АДНАСОБНІКАЎ.

10.800 тон адгрузім да 25 кастрычніка

КРУПКІ.

8 кастрычніка на пашыраным пленуме Крупскага РВК стаяла пытаньне аб уборцы і адгрузцы бульбы. Пленум абвясьціў сябе мабілізаваным на датэрміновае выкананьне плану ўборкі, загатовак і адгрузкі.

Паводле плану Крупскі раён павінен адгрузіць Ленінграду 10.800 тон бульбы. Пленум абавязаўся скончыць адгрузку не пазьней 25 кастрычніка.

Пленум выклікаў на сацспаборніцтва Быхаўскі раён.

С.

„НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ"

Узброім збожжазагатоўкі сацыялістычнымі мэтадамі працы

Горацкі раён пасьпяхова рэалізуючы плян збожжазагатовак пераносіць вопыт сваёй работы ў адстаючы Чавускі раён

ТЭМПЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ ПЕРАМОГУ

ГОРКІ.

Правільная ацэнка палітычна-гаспадарчай важнасьці збожжазагатовак з боку партыйных, савецкіх і загатоўчых арганізацый Горацкага раёну, ударнае разгортваньне кампаніі з самага пачатку ня паставілі Горацкі раён у рады перадавых раёнаў БССР па здачы збожжа дзяржаве.

Горацкі раён па-бальшавіцку змагаецца за выкананьне пляну збожжазагатовак. Раённыя арганізацыі сваячасова распрацавалі і давялі пляны збожжазагатовак да кожнага сельсавету. Для правядзеньня кампаніі на мясцох быў мабілізован увесь партыйны, прафэсыянальны, камсамольскі і савецкі актыў раёну.

На сходах калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў былі шырока абгаворваны пляны загатовак, прыняты самаабавязацельствы на здачу збожжа дзяржаве непасрэдна з-пад малатарні.

Калгасьнікі і аднаасобнікі Горацкага раёну з самага пачатку кампаніі адзначылі ня арганізацыяй буйных чырвоных абозаў, масавай здачай збожжа на загатоўчыя базы. Калгасьнікі бралі на буксір аднаасобны сэктар, дапамагалі сельсаветам у выкананьні заданьняў па здачы збожжа. На месцы пасьпяліся спэцыяльныя брыгады калгасьнікаў, якія арганізоўвалі сацспаборніцтва паміж аднаасобнікамі, дабіваліся поўнага і своячасовага выкананьня самаабавязацельстваў і кантрактацыйных дагавораў.

Масава-палітычная работа раённых арганізацый і сельсаветаў сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў нанесла руйнуючы ўдар па кулацтве і яго агентуры, якія вялі шалёную агітацыю супраць здачы збожжа дзяржаве.

У выніку бальшавіцкіх тэмпаў работы Горацкі раён дабіўся перамогі на фронце збожжазагатовак. На 1 кастрычніка раён выканаў гадавы плян збожжазагатовак на 61,4 проц. супроць 50 проц., вызначаных урадавым заданьнем.

Баявая задача горацкіх раённых арганізацый і ў першую чаргу загатоўчых — і надалей трымаць высокія тэмпы загатовак, забясьпечыць пасьпяховае завяршэньне кампаніі.



Падвозка збожжа да ссыпнага пункту.

***

Горацкія арганізацыі не абмяжоўваюцца толькі дасягненьнямі свайго раёну. Яны пераносяць вопыт сваёй работы ў адстаючы ЧАВУСКІ раён.

Арганізавана буксірная брыгада імя газэты «Зьвязда» для дапамогі чавускім раённым арганізацыям у правядзеньні збожжазагатовак. 7 кастрычніка брыгада ў складзе 6 чалавек выехала ў Чавусы.

Брыгадзір «Зьвязды»
С. БАРЫСЕВІЧ.

Выправіць дапушчаныя памылкі

БРАГІН. (Брыгада «Зьвязды»).

Гадавы плян збожжазагатовак па Брагінскім раёне на 5 кастрычніка выкананы усяго на 21,2 проц. Асноўная прычына прарыву заключаецца ў тым, што раённыя арганізацыі, сельсаветы і партячэйкі на мясцох не мабілізавалі шырокіх мас працоўных вакол гэтай кампаніі, не арганізавалі калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на рашучы адпор кулацка-заможным элемэнтам.

Наадварот, у некаторых сельсаветах кулакі знаходзяць адкрытае падтрыманьне з боку паасобных кіруючых работнікаў. Так, у Буркаўскім сельсавеце старшыня калгасу «Кастрычнік», разам з сакратаром камсамольскай ячэйкі, абараняюць кулака, якому выпадкова ўдалося пралезьці ў калгас, выступаюць супроць выключэньня яго з калгасу. Карыстаючыся патураньнем кіраўніцтва калгасу, гэты кулак злосна сабатуе збожжазагатоўкі і да апошняга часу ня здаў яшчэ ніводнага кілё збожжа.

Райкалгасаюз пры давядзеньні пляну да калгасаў дапусьціў рад памылак. Разьмеркаваньне колькасьці здачы збожжа кожным калгасам было праведзена мэханічна. У выніку атрымалася, што ў калгасе імя Варашылава, напрыклад, прыпадае здаць на кожны двор 1 цэнтнэр збожжа, а ў калгасе «Чырвоны кастрычнік» — 10 цэнтн.

Кіруючыя раённыя арганізацыі павінны неадкладна ўзмацніць тэмпы збожжазагатовак. Трэба дабіцца поўнай ліквідацыі верасьнёўскага прарыву і выкананьня кастрычніцкага пляну.

Райкалгасаюз абавязан выправіць дапушчаныя памылкі і ўзмацніць масавую работу сярод калгасьнікаў.

ГІЛОДЗІ, ПІГУНОЎ.

Чырв. Зорка (Пач. 7; 8-45; 10-30) — Новы замежны фільм **СЫН ЗОРА** у 8 ч. у гал. ролі **Дуглас Фэрбэнкс**

„Культура" (Пач. 7, 8-45, 10-30) — Новы фільм вытворч. „Межрабпомфільм" **НАНЕЦ ДЗЕРАГІКА.** Звыш праграм. Гордасьць „Трэцяга Рашаючага".

Інтэрнацыянал — 2 фільмы ў адзін сэанс: 1) **Дзеньнік адной камуны** 2) **Чарлі Чаплін у тэатры**

Пралетары (Дзт. з 12 г. дня) — Мастацкі фільм **„КАПРИЗ ЕКАТЕРИНЫ"** Пач. 1-га сэансу ў 2 г. дня.

„Новы Пікадор" (Суседнік кіно „Культура") — Мастацкі фільм **ТАРАС ТРАСІЛА** Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.

„Спартак" — З 11-га кастрычніка—баявік **БАДАВАРОТ** драма ў 6 частках.

КУРСЫ МОВАЎ І СТЭНАГРАФІІ
калектыву настаўнікаў.
Заняткі пачаліся. Прыём працягваецца.
Адкрываецца англійская дзіцячая група.
Канцылярыя курсаў адкрыта штодзённа, акрамя 5, 10, 15, 20, 25, 30 ад 6 да 8 гадз. Адрас: вул. Энгельса, 33, 24 я школа.

Інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных— магутная зброя ў руках пралетарыяту.
БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Менскі Гарком МОПР'у і ЦК МОПР'у БССР арганізуюць 16 кастрычніка' у 6 гадз. веч.
МАСАВЫ
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ВЕЧАР,
прысьвечаны
падзеям у Манчжурыі,
адкрыцьцю Усебеларускіх курсаў.
вынікам 2-га пленуму ЦК МОПР'у СССР.
1) З дакладамі выступяць: т. Рак-Міхайлоўскі (нам. старшыні ЦК МОПР'у БССР), т. Цудзін (сакратар ЦК МОПР'у БССР).
2) Інтэрнацыянальнае выступленьне.
3) Мастацкая частка—пастановы БДТ—1 „Ярасьць".
Уваходныя білеты атрымліваюць ячэйкі ў ГК МОПР'у штодзённа ад 10 да 4 і ад 7 да 10 г. веч.
Менскі ГК МОПР'у.
ЦК МОПР'у БССР.

Сёньня, 14 кастрычніка, у 6 гадз. веч.
Інстытут арг. рэканструкцыі с.-г. імя Леніна (Шырокая, 23) склікае
НАРАДУ ПА КАМБІКАРМОХ
з удзелам спэцыялістаў сьвінаводчага дасьледчага інстытуту, харчовага сэктару НКЗБ, навуковых працаўнікоў с. г., ВНУ.
Запрашаюцца прадстаўнікі зацікаўленых устаноў.

Пры Турскай дасьледчай станцыі
1 лістапада адкрываецца
ТЭХНІКУМ ПА НАСЕНАВОДСТВЕ ЛУГАВЫХ ТРАЎ
на базе скончыўшых сямігодку.
Прыём студэнтаў з 15 па 25 кастрычніка.
Умовы агульныя для ўсіх тэхнікумаў.
Пры тэхнікуме будзе для 50 проц. вучняў поўны інтэрнат.
Заявы падаваць па адрасе: п-а Гадзілавічы, Рагачоўскага р-ну, Турскай Дасьледчай станцыі, тэхнікуму.
ДЫРЭКЦЫЯ СТАНЦЫІ І ТЭХНІКУМУ.

У дадатак да абвесткі ў газ. „Зьвязда" ад 21-IX—31 г. за № 257,
Беларускі Лесатэхнічны інстытут
абвяшчае набор на 2-і і 3-ці курс дзённага рабфаку.
На 2 курс неабходны веды ў аб'ёме 6 груп, а на 3—поўны курс 7-годкі. Асобы, якія ня маюць дакумантаў аб асьвеце, павінны трымаць іспыты ў аб'ёме 6-7 груп сямігодкі.
У першую чаргу залічаюцца рабочыя з 3-гадовым стажам на прадпрыемстве. Прадстаўляецца перавага лесарубам—адыходнікам, якія маюць вытворчы стаж.
Заявы прымаюцца да 10 кастрычніка ў г. Барысаве, Маскоўская, 8.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Інстытут літаратуры і мастацтва БАН,
15 кастрычніка, 6 гадз. веч., у памяшк. інстытуту (Бан, 3-ці паверх, пакоі № 39) адбудзецца
пасяджэньне сэкцыі літаратуры.
Парадак дня: даклад т. А. Сянкевіча на тэму: «10 год беларускай літаратуры».
Запрашаюцца рабочыя літаратурныя гурткі, навуковыя працаўнікі БАН, асьпіранты, пісьменьнікі, студэнты, выкладчыкі літаратуры.
Уваход вольны.

ПЕРАД КАСТРЫЧНІЦКІМІ СЬВЯТАМІ

Сталінская эстафэта—у дні сьвята

(З пастановы Менгаркому КП(б)Б)

Сакратарыят Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б пастанавіў зараз-жа распачаць падрыхтоўку да сьвяткаваньня 14-ай гадавіны Кастрычніцкай Рэвалюцыі па ўсіх прадпрыемствах, у саўгасах, калгасах і школах. У ДНІ СЬВЯТА АБВЯШЧАЕЦЦА ПРЫЗЫЎ УДАРНІКАЎ ІМЯ 14-АЙ ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА.

У часе падрыхтоўкі да сьвята па ўсіх прадпрыемствах трэба правесьці масавую СТАЛІНСКУЮ ЭСТАФЭТУ па наступных 7 маршрутах.

1. За новыя крыніцы сацыялістычнага накапленьня; 2. барацьба з дробнабуржуазнай ураўнілаўкай; 3. за арганізаваны набор рабочай сілы; 4. за арганізаваны грамадзкага харчаваньня; 5. арганізацыя працы; 6. рамонт дамоў і азеляненьне раёнаў; 7. аўладаньне тэхнікай вытворчасьці.

Неабходна разгарнуць шырокую арганізацыйна-масавую і растлумачальную работу аб 14-ай гадавіне Кастрычніцкай Рэвалюцыі пад знакам асьвятлёнай Рэвалюцыі пад знакам асьвятлёнага міжнароднага становішча, посьпехаў і далейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва, чарговых практычных задач кожнай фабрыкі, заводу, саўгасу, калгасу і сельсавету.

Падрыхтоўка да сьвят павінна мабілізаваць шырокія масы рабочых, калгасьнікаў і працоўных на ажыцьцяўленьне наступных заданьняў:

Па практычнай рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна, няўхільным росьце ўсіх якасных і колькасных паказальнікаў прамфінплянаў, арганізацыі гаспакаў прамфінплянаў, арганізацыі гаспадарча-разрахунковых брыгад, масавым дарча-разрахунковых брыгад, масавым стажэ рабочых, калгасьнікаў і служачых сацыялістычнымі формамі працы; ударніцтвам і сацспаборніцтвам; па аўладаньні тэхнікай, па сацыялістычнай рацыяналізацыі і рэканструкцыі вытворчасьці, узьняцьці хвалі вынаходзтва і рацыяналізатарскіх прапаноў, паляпшэньні культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых, сапраўднай перабудове работы спажыўкааператарцы, паляпшэньні грамадзкага харчаваньня і г. д.

Падрыхтоўка да сьвята павінна даць рашучы эрух у галіне поўнага ажыцьцяўленьня праграмы разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, мясной прамысловасьці, узмацненьня саўгасаў усіх сыстэм, арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, арганізацыі новых калгасаў і масавага прыпіву бядняцка-сераднянцкіх мас у існуючыя калектыўныя гаспадаркі.

Неабходна мабілізаваць працоўныя масы вёскі на датэрміновае выкананьне плянаў загатовак збожжа і бульбы, ільну і гародніны, на поўную рэалізацыю заданьняў па пазыцы, поўнае выкананьне плянаў абавязковых і добраахвотных плацяжоў.

У часе падрыхтоўкі трэба разгарнуць вярбоўку ў рады КП(б)Б і ЛКСМБ лепшых ударнікаў з рабочых, работніц, калгасьнікаў і калгасьніц.

Сьвяткаваньне павінна прайсьці пад знакам непрымірымай барацьбы з усякімі ўхілам ад генэральнай лініі партыі, барацьбы з правым, асабліва небясьпечным на даным этапе і «левым» ухілам і прымірэнчымі адносінамі да іх' барацьбы з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, беларускім контр-рэвалюцыйным нацдэмакратызмам, антысэмітызмам і шавінізмамі іншых копераў, пад знакам яшчэ большай згуртаванасьці працоўных мас вакол ленінскай камуністычнай партыі.

УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ ІМЯ 14 ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА

(З пастановы Мен. ГСПС)

ПРЭЗЫДЫУМ МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫХ САЮЗАЎ РАСПРАЦАВАЎ ПАДРАБЯЗНЫ ПЛЯН СЬВЯТКАВАНЬНЯ 14-й ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ, НА ЎСІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ, УСТАНОВАХ, САЎГАСАХ І ПАДШЭФНЫХ КАЛГАСАХ АРГАНІЗУЕЦЦА МАСАВАЯ ПРАВЕРКА ВЫКАНАНЬНЯ ДАГАВАРОЎ ПА САЦСПАБОРНІЦТВЕ І РЭАЛІЗАЦЫІ ЎКАЗАНЬНЯЎ ТАВ. СТАЛІНА. ПРАВЕРКА ПАВІННА БЫЦЬ СКАРЫСТАНА ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА ПАШЫРЭНЬНЯ ЎДАРНАГА РУХУ, ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ БРЫГАД ІМЯ 14-й ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ. УСЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, ЦЭХІ, БРЫГАДЫ, САЎГАСЫ, ПААСОБНЫЯ РАБОЧЫЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ АХОПЛЕНЫ ДАГАВАРАМІ, ЗАСНАВАНЫМІ НА ВЫКАНАНЬНІ ЗАДАЧ, ПАСТАЎЛЕНЫХ ТАВ. СТАЛІНЫМ, НА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ ПЛЯНАЎ 4 КВАРТАЛУ І САЦДАГАВОРУ, ЗАКЛЮЧАНАГА З ПРАФСАЮЗАМІ ЗАХ. ВОБЛАСЬЦІ.

У ЧАСЕ АБЕДЗЕНАГА ПЕРАПЫНКУ ПРАВОДЗЯЦЦА ГУТАРКІ СТАРЫХ РАБОЧЫХ І ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ З НОВЫМІ РАБОЧЫМІ І МОЛАДЗЬДЗЮ АБ МІЖНАРОДНЫМ СТАНОВІШЧЫ, ДАСЯГНЕНЬНЯХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА І ДАЛЕЙШЫХ ЗАДАЧАХ.

КАСТРЫЧНІК АБВЕШЧАН МЕСЯЦАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ПАХОДУ ЗА РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІЯ І ВЫНАХОДНІЦКІЯ ПРАПАНОВЫ ПАД ЛЁЗУНГАМ: «КОЖНЫ РАБОЧЫ — УДАРНІК, ДА 14-й ГАДАВІНЫ НЯ МЕНШ АДНЭЙ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКАЙ ПРАПАНОВЫ!».

У ПАДШЭФНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ ПАСЫЛАЮЦЦА РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ДАПАМАГЧЫ ВЫКАНАНЬНЮ ЧАРГОВЫХ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНЫХ ЗАДАЧ.

УСІМ ПРАФАРГАНІЗАЦЫЯМ МЕНСКУ ПРАПАНАВАНА МАБІЛІЗАВАЦЬ АКТЫЎ НА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ БАЯВОГА ЗАДАНЬНЯ — ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ СЬВЯТ ПРЫСТАСАВАЦЬ АБВЯШЧЭНЬНЕ МЕНСКУ ГОРАДАМ СУЦЭЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЬЦІ; ДЛЯ ГЭТАГА ТРЭБА АХАПІЦЬ УСІХ ПРАЦОЎНЫХ ПАЛІТЫЧНАЙ, ТЭХНІЧНАЙ І АГУЛЬНАЙ ВУЧОБАЙ, ДАБІЦЦА ПОЎНАГА АХОПУ НЯПІСЬМЕННЫХ ЛІКПУНКТАМІ.

ТРЭБА ШЫРОКА ПАПУЛЯРЫЗАВАЦЬ РАБОТУ ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАД, А ТАКСАМА БРЫГАД, ЯКІЯ ПРАКТЫКУЮЦЬ ЗЬМЕННА-СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ. НЕАБХОДНА ДАБІЦЦА ПЕРАВОДУ ЎСІХ ЦЭХАЎ І БРЫГАД НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК, РАШУЧА ЎЖЫВАЦЬ ВОПЫТ ШТОДЗЕННАГА АПЭРАЦЫЙНАГА ПЛЯНАВАНЬНЯ.

ПРЭЗЫДЫУМ ГСПС ПАСТАВІЎ ПЕРАД УСІМІ ПРАФАРГАНІЗАЦЫЯМІ ЗАДАЧУ — **ДАБІЦЦА ВЫКАНАНЬНЯ 50 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ 4-ГА КВАРТАЛУ ДА 7-ГА ЛІСТАПАДА.**

ПА КЛЮБАХ АРГАНІЗУЮЦЦА ВЫСТАЎКІ РАБОТ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ПАДШЭФНЫХ СЕЛЬСАВЕТАЎ, ВЫСТАЎКІ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ ЛЕПШЫХ УДАРНЫХ БРЫГАД І ЎДАРНІКАЎ.

У СМАЛЕНСК НА СЬВЯТЫ ВЫЯЖДЖАЕ ДЭЛЕГАЦЫЯ АД ПРАЦОЎНЫХ МЕНСКУ. БУЙНЕЙШЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ: ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, «КАСТРЫЧНІК», «КАМУНАР», «ДРЭВАПРАЦОЎШЧЫК» І ІНШ. АРГАНІЗУЮЦЬ ПАСЫЛКУ ЛІСТОЎ РАБОЧЫХ ЗАВОДЗКІМ КАЛЕКТЫВАМ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН.

НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ І ЎСТАНОВАХ ПРАВОДЗЯЦЦА СУМЕСНА З ПАДШЭФНЫМІ ВАЙСКОВЫМІ ЧАСЬЦЯМІ І КАЛГАСАМІ ЎРАЧЫСТЫЯ ВЕЧАРЫ З ПРЭМІЯВАНЬНЕМ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ, ГЕРОЯЎ ПЯЦІГОДКІ. НА ГЭТЫХ ВЕЧАРОХ ПЕРАДАЮЦЦА Ў РАДЫ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ ЛЕПШЫЯ РАБОЧЫЯ-ЎДАРНІКІ, ЯКІЯ НА СПРАВЕ ДАКАЗАЛІ СВАЮ АДДАНАСЬЦЬ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

Віцебск рытхуецца да сьвята

**ВІЦЕБСК (БЕЛТА). У СУВЯЗІ З НАДЫХОДЗЯ